ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 80 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, т.л. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пескрод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

АЎТОРАК, 11 сакавіка 1930 г. № 59 (3567) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Узмацнім барацьбу з перагібамі

Вялізарныя посьпехі калгаснага будаўніцтва ў БССР выразна сьведчаць аб тым, што партыя, вядучы за сабою масы, кіруючы імі, ні на хвіліну ня траціла сувязі з імі. Мы зьяўляемся сьведкамі вялікага імкненьня бядняцка-серадняцкіх мас да калектыўных форм вядзеньня сельскае гаспадаркі. Бядняк, а за ім і серадняк, масай пашлі ў калгас, пераканаўшыся ў перавагах буйное аграмаджанае гаспадаркі перад дробнай індывідуальнай.

Калгасны рух—масавы добраахвотны рух. Гэта—вялікі паход асноўных пластоў вёскі супроць прадзедаўскіх форм гаспадараньня, супроць тае галечы і цемры, у якой знаходзілася вёска. Гэта паўстаньне мас супроць таго «ідыётызму» вясковага жыцьця, аб якім калісьці пісаў Маркс. Гэта—вынік сапраўды вялізарнейшай папярэдняй работы, праведзенай партыяй за гады НЭП'у. Гэта—вынік правільнага ленінскага кіраўніцтва партыі.

«Карэнны паварот вёскі да сацыялізму можна лічыць забясьпечаным», —адзначае тав. Сталін у артыкуле «Головокружение от успехов». «Посьпехі нашай калгаснай палітыкі тлумачацца, паміж іншым, тым, што яна, гэта палітыка, апіраецца на добраахвотнасьць калгаснага руху»,—піша далей т. Сталін у тым-жа артыкуле.

На жаль, у радзе раёнаў нашай рэспублікі мелі месца абураючыя факты скажэньня партыйнай палітыкі ў вёсцы. Асобныя гора-адміністратары падмянілі масавую растлумачальную работу голым адміністраваньнем. Яны забылі, што добраахвотнасьць калгаснага руху зьяўляецца залогам яго посьпеху. Забылі, што прымус, пагрозы па адрасе сялян, якія не жадаюць уступіць у калгас, вядуць да дыскрэдытацыі калгаснага руху, да яго падрыву, а не ўзмацненьня.

Арганізацыя калгасаў без папярэдняга растлумачэньня сутнасьці калектывізацыі, без паглыбленай і ўзмоцненай работы сярод беднаты, без рэзкага адпору і выкрыцьця кулацкай агітацыі, без мабілізацыі мас на барацьбу з клясавым ворагам ня можа даць станоўчых вынікаў. Калгасы, заснаваныя шляхам прымусу, ня могуць быць моцнымі. Будуць папяровыя рэзалюцыі аб пераходзе да калектыўных форм гаспадараньня, будуць папяровыя калгасы, але ня будзе сапраўдных калектыўных гаспадарак.

У сёпешнім нумары «Зьвязды» чытач знойдзе рад фактаў, якія выразна ілюструюць гэта.

У некаторых мясцох, напрыклад, у Лельчыцкім раёне на Мазыршчыне, у Круглянскім раёне на Аршаншчыне і г. д. асобныя работнікі прыступалі да абагуленьня жывёлы і насельня раней да арганізацыі калгасаў. У Засьпінскім сельсавеце (Гомельшчына) адмовілі выдаць спраўку для прадстаўленьня ў амбуляторыю хвораму бедняку, які не ўвайшоў у калгас. Былы старшыня Сепенскага райвыканкому (Віцебшчына) стварыў спэцыяльную тэорыю, што для посьпеху калектывізацыі неабходна раскулачыць некаторых сераднякоў. У Ровенска-Слабодзкім сельсавеце (Гомельшчына) спажывецкае таварыства загадала ўсім сваім членам у трохдзённы тэрмін уступіць у калгас, пагражаючы ў праціўным выпадку спыніць выдачу прадуктаў. Яшчэ далей пашоў сакратар Лучыцкай парт'ячэйкі (Мазырская акруга), які арыштаваў бедняко ў і серадняко ў, якія адмаўляліся ўступіць у калгас. Нарэшце, рэкорд галавацяпства пабіў старшыня Старынкаўскага сельсавету, Койданаўскага раёну, забараніўшы у якасьці рэпрэсыўнай меры выдаваць газэты жанчынам, якія не згадзіліся з яго прапановамі.

Характэрна, што ў большасьці выпадкаў голае адміністраваньне, перагібы ў адносінах серадняка ідуць побач з адсутнасьцю ўсякай работы сярод беднаты, прымірэнчымі адносінамі да кулака. Нездольныя згуртаваць бядняцка-батрацкае ядро, нездольныя замацаваць саюз з серадняком, не мабілізуючы масы на барацьбу з кулаком, —усе гэтыя работнікі, стыкаючыся з фактамі слабога тэмпу калектывізацыі, ня бачаць другога выхаду, як у націску, прымусе, дэкрэтаваньні калгаснага будаўніцтва зьверху.

Учора мы падалі вельмі паказальны ў гэтых адносінах факт з практыкі Лёзьнянскага раёну па Віцебшчыне. Тут не вялося ніякай работы сярод беднаты і батрацтва. Нядзіва таму, што бядняк туга пашоў у калгас, што кулак карыстаўся ўплывам у частцы беднякоў. З гэтага мясцовыя работнікі зрабілі вывад, што пры калектывізацыі пельга разьлічваць на беднату, што ўпор у рабоце трэба зрабіць на серадняка, што можна згортваць групы беднаты.

Недаацэнка значэньня арганізацыі беднаты, прымірэнчыя адносіны да кулака, антысерадняцкія наскокі,—усё гэта зьявішчы аднаго і таго-жа парадку. Усё гэта ў выніку зьяўляецца выразным праяўленьнем правага апартунізму на практыцы.

Да чаго прыводзяць мэтады унтэра Прышыбеева, якія ўжываліся ў асобных мясцох пры калектывізацыі? Якія вынікі дае злачыннае скажэньне лініі партыі?

Практыка месц, аб якой мы пісалі вышэй, дае вычэрпваючы адказ на гэтыя пытаньні.

Тут мы маем узмацненьне актыўнасьці кулацтва. Клясавы вораг выкарыстоўвае кожную памылку, кожны промах нашых мясцовых работнікаў. Ён прабуе перацягнуць на свой бок серадняцтва. І ў асобных вёсках, дзе скажаліся дырэктывы партыі, яму гэта ўдавалася. Там наглядаюцца выпадкі выхаду сялян з калгасаў. Абагуленьне рабочай і тавара-прадукцыйнай жывёлы ідзе вельмі марудна.

Партыя вядзе рашучую, бязьлітасную барацьбу з злачынцамі, якія робяць замах на аснову асноў партыйнай палітыкі ў вёсцы—на саюз з серадняком. Савецкая ўлада бязьлітасна будзе караць усіх тых, хто льле ваду на млын клясавага ворага. Паказальнымі працэсамі, суровымі прыгаворамі мы спынім у корані спробы дыскрэдытацыі калгаснага руху.

Ударыўшы па руках усіх тых, хто прабуе падарваць сувязі з масамі, партыя павядзе за сабой уперад стотысячныя атрады беднякоў і серадняко ў для далейшых перамог на фронце вялікай будоўлі новай сацыялістычнай вёскі.

МЫ МОЖАМ ЗАСТАЦЦА БЯЗ ТРАКТАРАЎ

ПАШЫРЭНЬНЕ ТРАКТАРНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ІДЗЕ ВЕЛЬМІ ДРЭННА

Пашырэньне і рэалізацыя трактарных абавязацельстваў па Беларусі знаходзіцца пад пагрозаю зрыву.

Да 1-га красавіка па БССР павінна было быць рэалізавана трактарных абавязацельстваў на суму ў 1.300.000 руб. Покуль-што рэалізавана абавязацельстваў на 328.000 руб., пры чым грошай па гэтых абавязацельствах паступіла ўсяго толькі на суму 201.800 руб.

Па асобных акругах рэалізацыя і паступленьне сродкаў па абавязацельствах ідзе яшчэ горш. У Гомельскай акрузе на 1-га сакавіка рэалізавана трактарных абавязацельстваў на суму ў 51.000 руб., ці 25 проц. пляну, а паступленьняў па іх на сёпешні дзень няма ні аднае капейкі. Такое-ж становішча ў Віцебскай акрузе, дзе па рэалізаваныя абавязацельствы на 32.000 руб. не паступіла таксама ні капейкі.

Менская акруга павінна была паводле пляну рэалізаваць трактарных абавязацельстваў на 200.000 руб., на сёпешні дзень рэалізавала ўсяго на 10.000 руб.

Калгасцэнтр, Акркалгассаюзы і Райкалгассаюзы, якія павінны сыстэматычна праводзіць работу па пашырэньні трактарных абавязацельстваў, нічога не зрабілі ў справе забесьпячэньня калгасаў трактарамі, у справе пашырэньня трактарных абавязацельстваў. Ніякай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў аб важнасьці і значэньні трактарных абавязацельстваў—не вядзецца. Есьць цэлы рад калгасаў, якія нават ня чулі і ня ведаюць аб значэньні трактарных абавязацельстваў.

Акрэа таксама не зварачаюць належнае ўвагі на пашырэньне трактарных абавязацельстваў. Весткі аб рэалізацыі, якія даюцца Акрэа, не адпавядаюць сапраўднасьці. Менскі Акрэа дае весткі аб рэалізацыі абавязацельстваў па 76.000 р., а ў сапраўднасьці рэалізавана толькі на 10.000 руб.

Да гэтага часу яшчэ не растлумачана калгасам, што сапраўдная рэалізацыя трактарных абавязацельстваў не азначае толькі галасаваньне за іх набыцьцё, але і ўзнос грошай.

У іншых рэспубліках Саюзу рэалізацыя трактарных абавязацельстваў праходзіць вельмі пасьпяхова і ў некаторых акругах ужо адчуваецца нястача у іх.

Праўленьне Дзяржбанку Саюзу зьвярнулася ў Дзяржбанк Беларусі з папярэджаньнем, што калі ў бліжэйшыя 10 дзён абавязацельствы ня будуць пашыраны, яны павінны быць адасланы ў іншыя раёны Саюзу. Такім чынам, калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры, мы стаім перад пагрозай скарачэньня водпуску трактароў для БССР.

БССР павінна поўнасьцю рэалізаваць адпушчаныя для яе трактарныя абавязацельствы, павінна поўнасьцю забясьпечыць сябе патрэбнымі трактарамі.

Калгасы і акруговыя зямельныя аддзелы павінны павесьці шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў аб важнасьці значэньня выпушчаных трактарных абавязацельстваў.

Трэба дабіцца, каб ні адзін калгас не застаўся без трактарных абавязацельстваў.

Калі гэта работа з усёй сур'ёзнасьцю ня будзе ў бліжэйшым часе разгорнута, БССР стаіць пад пагрозаю значнага скарачэньня завозу трактароў.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Неадкладна аздаравіць кіраўніцтва фабрыкай

Асноўная маса рабочых і работніц „Дняпроўскай Мануфактуры" гатова дабіцца пералому ў рабоце фабрыкі

Правільным кіраўніцтвам ім трэба ў гэтым дапамагчы

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Зараз ужо можна зрабіць некаторыя агульныя вывады аб прычынах, якія прывялі фабрыку «Дняпроўская Мануфактура» да напружанага становішча.

— Слабое кіраўніцтва фабрычных арганізацый, безадказныя адносіны да вытворчасьці гаспадарнікаў і, як вынік гэтага, заняпад працоўнай дысцыпліны, рост прагулаў і сымуляцыі, поўная безгаспадарчасьць, п'янства майстроў і падмайстроў — вось асноўныя прычыны.

Важнейшае пытаньне — падрыхтоўка кадраў кваліфікаваных рабочых, у якіх фабрыка адчувае надзвычайна вялікую патрэбу, — **злачынна ігнаравалася б. дырэктарам фабрыкі Кірэевым і фабрычнымі арганізацыямі.** Каля 50 ткацкіх варштатаў кожны дзень не працуюць з-за адсутнасьці ткачоў. Нават калі ЦП саюзу ў сьнежні мінулага году прапанавала **адкрыць курсы для дарослых,** гэта ня было зроблена. Не адкрывалі і ФЗУ, бо, як тлумачыць намесьнік дырэктара... **ЦП саюзу катэгарычна супярэчыла (?)**

Так, фабрыка працавала амаль год. **Ні партыйныя, ні прафэсыянальныя арганізацыі** не паставілі пытаньня аб падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы.

Пра поўную безгаспадарчасьць адміністрацыі добра сьведчаць і такія факты: інвэнтар на сотні тысяч рублёў валяўся пад адкрытым небам (валяецца яшчэ і зараз) і пакрываецца іржою. На майстроў і падмайстроў, большасьць якіх прыходзіць на работу п'янымі са спазьненьнем на некалькі гадзін, ніякіх спагнаньняў не накладвалася.

Аб дрэнным кіраўніцтве з боку партыйнай, камсамольскай і прафэсыянальнай арганізацыі фабрыкі газэта «Зьвязда» пісала ўжо. Трэба яшчэ дадаць, што культурна - масавая работа не праводзілася. Клюб не арганізаваў рабочых наўкола вытворчых задач дня. Парткалектыў ня толькі не праводзіў работы сярод беспартыйных рабочых, але нават не наладзіў яе і сярод членаў партыі.

Вылучэньне рабочых на кваліфікаваную работу — рэдкае зьявішча на фабрыцы «Дняпроўская Мануфактура». Аднак, вылучэньне работніцы Рузінай у намесьнікі загадчыка падрыхтоўчым цэхам зьяўляецца поўным скажэньнем лёзунгу вылучэньня. Работніца Рузіна была ня прыкладнай у цэху, адносілася няўважліва да работы і таму яна ніякім аўтарытэтам у цэху не карысталася. ФЗК супроць такога вылучэньня ня выступіў, а старшыня ФЗК тав. Апей на гэта адказаў так: «Зараз адзіначальле, і мы нічога ня можам зрабіць з адміністрацыяй» (ня дрэнна зразумеў сутнасьць адзіначальля!).

Як вядома, адным са сродкаў заахвочаньня рабочых зьяўляецца прэміяваньне за лепшую работу. Але гэта не практыкавалася на фабрыцы. Толькі зараз зроблены першыя крокі — вызначана 25 прэмій. Але вызначэньне рабілася ў габінэтах, без прыцягненьня рабочых да гэтай справы, без стварэньня грамадзкай думкі наўкола гэтага пытаньня. І таму правільна зрабіў апошні сход рабочых, які зьняў гэтае пытаньне з абгаварэньня і прапанаваў дэтальна абмеркаваць яго на цэхавых сходах рабочых, дае і вызначыць кандыдатуры для прэміяваньня.

Зусім недапушчальным зьяўляецца нескарыстаньне больш 4.000 руб., адпушчаных на ахову працы. І гэта ў той час, калі амаль ні ў адным цэху няма вэнтыляцыі, калі рабочым фарбавальшчыкам не выдавалі, прадугледжаных па калектыўнай умове, спэцыяльных рукавіц, з прычыны чаго яны апякалі руку і часта карысталіся водпускамі і г. д. Прафарганізацыя і тут нічога не зрабіла.

Фабрычным арганізацыям трэба хутчэй перабудаваць сваю работу пановаму, сапраўды павярнуцца тварам да вытворчасьці, адмовіцца ад габінэтнага кіраўніцтва, а штодзенна дапамагаць кіраўніцтву ў практычнай рабоце па ліквідацыі прарыву на фабрыцы.

Р. Д.

АД РЭДАКЦЫІ: Рад артыкулаў аб «Дняпроўскай Мануфактуры», зьмешчаных у «Зьвязьдзе», выразна сьведчыць аб нездольнасьці цяперашніх бюро парткалектыву і фабкому (ня кажучы ўжо аб адміністрацыйнай верхавіне) даць наложны напраматы гатоўнасьці асноўнай масы рабочых і работніц дабіцца рашучага пералому ў рабоце фабрыкі, дабіцца ажыцьцяўленьня прамфінпляну. Такі вывад павінна была зрабіць (і, здаецца, зрабіла) камісія Аршанскага акругкому, якая працавала на фабрыцы. Між тым, ня гледзячы на тое, што прайшло шмат часу, НІЯКІХ ВЕСТАК АБ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ І ЎСЯКІХ ІНШЫХ ВЫВАДАХ — НІ АД КАМІСІІ, НІ АД САМОГА АРШАНСКАГА АКРУГКОМУ МЫ НЕ АТРЫМАЛІ. Мы просім Аршанскі акругком паведаміць нас аб мерапрыемствах, якія прыняты для аздараўленьня кіраўніцтва фабрыкай і наогул для паляпшэньня работы фабрыкі.

Лепшы рабочы



ТАВ. КАПЛАН А.—рабочы лайкавага цэху заводу «БАЛЬШАВІК». Вытворчы стаж—36 год. Норма выпрацоўкі каляровых скурак—55 у дзень, ён-жа выпрацоўвае—70-75.

Зводкі з гаспадарчага фронту

Заводы мэталятрэсту ліквідуюць прарывы

ЛЮТЫ па ўсіх заводах МЭТАЛЯТРЭСТУ даў значнае паляпшэньне становішча: цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» (Аршанская акруга) выканаў вытворчую праграму на 119,5 проц., гомельскі завод «Пралетары»—на 103,2 проц., віцебскі завод «Камінтэрн»—на 106,1 проц.

Не забывацць аб гадавой пічбе

«Чырвоны Мэталісты» (Віцебск) выканаў заданьне за люты на 101,7 проц. Паводле праграмы, павінна было быць выпушчана прадукцыі на 406.000 руб., выпушчана на 412.000 руб. Але за мінулыя 4 месяцы завод выканаў праграму толькі на 79 проц. Такім чынам, прарыў за мінулыя месяцы яшчэ не ліквідаваны.

* * *

«Рухавік Рэвалюцыі» (Гомель) выканаў вытворчую праграму за люты на 108 проц. Паводле пляну, за гэты месяц павінна было быць выпушчана прадукцыі на 85.000 руб., выпушчана—на 92.000 руб.

Добра, але ня зусім

Чыгуна-ліцейны завод «Чырвоны Адраджэнец» (Магілеў) за люты некалькі падцягнуўся. Паводле заданьня, завод павінен быў выпусьціць прадукцыі на 47.500 руб., выпушчана-ж на 62.000 руб., што складае 131 проц. заданьня. Аднак, гэтым посьпехам завод не ліквідаваў яшчэ прарыву за мінулых 4 месяцы. За час з кастрычніка па люты завод выканаў вытворчую праграму толькі на 63 проц.

Дагнаць і перагнаць!

Швэйныя фабрыкі працавалі ў лютым здавальняюча, даўшы па трэсьце 106,1 проц. выкананьня вытворчай праграмы. Фабрыка «Кастрычнік» (Менск) выканала вытворчую праграму на 110,8 проц., фабрыка «Прафінтэрн» (Віцебск)—на 100,3 проц., фабрыка «Камінтэрн» (Гомель)—на 112,6 проц. 1 фабрыка імя Валадарскага (Магілеў)—на 104,8 проц.

На 16,9 проц. больш

Гута «Камінтэрн (Бабруйск) выканала вытворчую праграму за люты на 116,9 проц. Паводле пляну, гута павінна была выпусьціць рознага шкла на суму 100.000 руб., выпушчана ж на 117.000 руб. Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы ўзьняцьцю прадукцыйнасьці працы (3,3 проц.). Прагулы па нягрунтоўных прычынах зьведзены да мінімуму.

На 1,4 проц. менш

Гута «Пралетары» (Менск) недавыканала вытворчую праграму за люты на 1,4 проц. Паводле праграмы, яна павінна была выпусьціць прадукцыі на 64.600 руб., выпушчана-ж на 63.700 руб.

Слаборніцтва паміж мілітарыстымі па узбраеньні

Імпэрыялістычнае выступленьне італьянскай газэты

РЫМ, 6. У сувязі з абгаварэньнем у італьянскім парляманце бюджэту міністэрства авіяцыі, «Джорнале д'Італія» выступае з патрабаваньнем узмацненьня італьянскага паветранага флёту.

«Пры наяўнасьці лёнданскай морскай канфэрэнцыі і ўсялкіх іншых міжнародных «мірных» пачынаньняў, — піша газэта, — дзяржавы толькі і думаюць аб удасканаленьні тэхнічных сродкаў вайны, сярод якіх авіяцыя зьяўляецца найноўшым і найбольш магутным. Авіяцыя відазьмяняе і памнажае мэтады вядзеньня вайны і з дапаможнага роду зброі ператвараецца ў асноўны, які ня ўступае па сваім значэньні ў арміі флёту. Аднак, Італія не вызначае выстарчальных сродкаў паветранаму флёту. Францыя траціць на авіяцыю 24½ усіх вайсковых выдаткаў, а Італія — толькі 15 проц. У працягу некалькіх год асыгнаваньні на італьянскую авіяцыю застаюцца на ўзроўні 700 мільёнаў лір а Францыя выдаткоўвае 2.768 міл. франкаў. Французкі паветраны флёт перавышае паветраныя флёты Англіі, Італіі і СССР, разам узятыя. Супроць 1.840 французкіх аэраплянаў першай лініі Італія можа выставіць толькі 800».

Разгортваньне ваеннай прамысловасьці ў Чэха-Славакіі

ПРАГА, 9. Чэхаславацкае вайсковае міністэрства ў апошнім часе разьвівае энэргічную дзейнасьць па разгортваньні ваеннай прамысловасьці ў Чэхаславакіі. Па дырэктывае вайсковага міністэрства ў Фалькэнаў арганізуецца дасьледчая лябараторыя па здабываньні азоту з паветра з тым, што лябараторыя ў выпадку вайны будзе абернута ў буйное прамысловае прадпрыемства. У Славакіі пры ўдзеле вайсковага міністэрства арганізуецца новы патронны завод. Фірма «Бэміш-Мэрышэ Кольбэн АП», генэральным дырэктарам якой нядаўна назначаны дырэктар паўдзяржаўпага заводу зброі ў Брно, аднаўляе цяпер вытворчасьць зброі. Ружэйны завод Янікіна, таксама зьвязаны з вайсковым міністэрствам, падрыхтоўвае на сваіх прадпрыемствах вытворчасьць матацыклаў. (ТАСС).

ЮГА-СЛАВІЯ БУДУЕ НОВЫЯ ВАЕННЫЯ ЗАВОДЫ

ВЕНА, 26. Паміж юга-слаўскім урадам і прадстаўнікамі вайсковых заводаў Шнэйдэр—Крэзо і Шкода распачаліся перагаворы аб пабудове суднабудаўнічага заводу для патрэб юга-слаўскага вайсковага флёту і фабрыкі амуніцыі і зброі ў Белградзе.

Поўны правал куцепаўскай кампаніі

ПАРЫЖ, 9. Пасьля 6-тыднёвай сьвістапляскі ў апошнія дні ўвесь французкі друк нібы па камандзе рэзка абарваў усякую інфармацыю пра куцепаўшчыну. Гэта тлумачыцца апошнімі выкрыцьцямі некаторых газэт, якія пачалі грызьціся наміж сабою і белагвардзейскіх клік ад падазронай ролі ва зьнікненьні Куцепава белагвардзейцаў, якія акружалі яго, а іменна, намочніка Куцепава палкоўніка Зайцава, генэрала Дзьяканава і інш. У грызьні паміж групамі кірылаўцаў і куцепаўцаў выявілася, між іншым, што Куцепаў зьяўляецца кіраўніком падрыхтоўкі тэрарыстычных актаў у Савецкім Саюзе. Усе гэтыя выкрыцьці прымусілі паасобныя французкія колы задумацца над роляю белагвардзейскае эміграцыі ва Францыі.

8-га сакавіка за мяжой

Дэманстрацыі ў Беластоку і Вільні

Суровая расправа над дэманстрантамі

ВАРШАВА, 9. 6 сакавіка адбыліся вялікія дэманстрацыі ў Беластоку і Вільні. Паліцыя, разганяючы дэманстрацыі, сурова распраўлялася з дэманстрантамі. Дэманстрацыя адбылася таксама ў Пабіяніцах.

Гульня ППС у апазыцыю

ВАРШАВА, 9. Пасьля доўгіх ваганьняў ППС адважылася паладзь у сойм прапанову з выказам недавер'я міністру працы Прыстэру. Адначасова эндэкі падалі прапанову аб недавер'і міністру асьветы Чарвінскаму.

* * *

Партыі цэнтру і левыя партыі падаюць на бліжэйшым пасяджэньні сойму прапанову прыцягнуць да судовай адказнасьці былога міністра ўнутраных у процізаконным выдатканьні 8 мільёнаў злотых з сакратнага фонду прэзыдыуму рады міністраў. Гэтыя сумы былі выкарыстаны для агітацыі на выбарах за беспартыйны блёк.

МАСАВЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ У КІТАІ

ШАНХАЙ, 9. У міжнародны дзень работніцы ў розных частках Шанхаю адбываліся дэманстрацыі рабочых, работніц і студэнтаў. Паліцыя страляла ў дэманстрантаў і правяла арышты. Паведамляюць таксама аб дэманстрацыях у Нанкіне, Вуху і Хэнані.

8 сакавіка—дзяржаўнае сьвята ў Манголіі

УЛАНБАТОР, 9. Дзень 8 сакавіка, абвешчаны ў гэтым годзе наводле патрабаваньняў працоўных жанчын дзяржаўным сьвятам у Манголіі, прайшоў з выключным уздымам.

Баявая клятва нямецкіх работніц

БЭРЛІН, 9. У сувязі з міжнародным жаночым днём ЦК нямецкай кампартыі перадаў УсеКП(б) баявую клятву нямецкіх работніц абараняць СССР.

ЗЬЕЗД ПРАДСТАЎНІКОЎ «САВЕЦКІХ ТЭРЫТОРЫЙ» КІТАЮ

ШАНХАЙ, 10-III. З лятучак, якія распасюджваліся тут у міжнародны дзень работніц, відаць, што кітайская кампартыя склікае на 30-га мая зьезд прадстаўнікоў «савецкіх тэрыторый», т. зн. тых кітайскіх тэрыторый, у межах якіх абвешчана савецкая ўлада.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Працэс украінскай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі „СВУ"

ХАРКАЎ. 9-га сакавіка вечарам Вярхоўны суд УССР у складзе старшыні т. Прыходзькі і членаў суда т. т. Воўкава, Сакалянскага (прафэсар), Адынца (селянін), Мухі, Карабенкі (рабочыя) і Кар жэнкі (селянін) распачаў разгляд справы «СВУ» (Саюз Вызваленьня Украіны).

Гэтая арганізацыя ставіла сабе задачай скінуць савецкую ўладу на Украіне шляхам узброенага паўстаньня і ўстанавіць капіталістычна-буржуазны лад.

У якасьці дзяржаўных абвінавачуаў на працэсе выступаюць: намесьнік Наркома Юстыцыі, генэральны пракурор рэспублікі т. Міхайлік, намесьнік пракурора Вярхоўнага суда УССР т. Ахматаў, пракурор НК Юстыцыі т. Якімішын і кіеўскі акруговы пракурор т. Выструкоў.

У якасьці грамадзкіх абвінавачуаў выступаюць: ад украінскага савету прафсаюзаў т. Любчанка, ад усеукраінскай сэкцыі навуковых працаўнікоў прафэсар харкаўскага сельска-гаспадарчага інстытуту акадэмік Саналоўскі і ад фэдэрацыі савецкіх пісьменьнікаў пісьменьнік Сьлісарэнка. Па халайніцтве ўсеукраінскай сэкцыі навуковых працаўнікоў Вярхоўны суд дазволіў прыняць удзел у працэсе ў якасьці грамадзкага абвінавачуў таксама старшыні кіеўскай сэкцыі навуковых працаўнікоў акадэміку Краўчуку.

Абвінавачаных абараняюць 14 членаў калегіі абаронцаў.

Вялікая заля дзяржаўнай опэры, дзе адбываецца працэс, перапоўнена працоўнымі. У дыплёматычнай лёжы прысутнічае консульскі корпус у поўным складзе. На лаўцы падсудных 45 абвінавачаных на чале з акадэмікам Яфрэмавым, Чахоўскім, Дурдукоўскім, Гэрмайзэ, Нікоўскі, Паўлушковым і Старыцкай-Чарняхоўскай

Старшыня суду Прыходзька апытвае ўсіх абвінавачаных аб іх сацыяльным паходжаньні. Аказваецца, што ўсе яны паходзяць з сем'яў абшарнікаў, царскіх чыноўнікаў, афіцэраў і попаў. Амаль што ўсе абвінавачаныя належаць да буржуазнай інтэлігенцыі. Сярод іх шмат выдатных дзеячоў украінскіх сацыялістых-фэдэралістых, а таксама украінскіх сацыял-дэмакратаў. Акадэмік Яфрэмаў—былы таварыш старшыні цэнтральнай рады, былы старшыня ЦК партыі украінскіх сацыялістых-фэдэралістых. Чахоўскі—былы прэм'ер-міністар ураду УНР (украінская народная рэспублікі), член ЦК партыі украінскіх сац.-дэмакратаў, ён-жа кіраўнік аўтакэфальнай царквы. Яго родны брат—поп аўтакэфальнай царквы. Нікоўскі—займаў пасаду міністра замежных спраў УНР, быў членам ЦК партыі украінскіх сацыялістых-фэдэралістых. Студэнт кіеўскага Інстытуту народнае асьветы Паўлушкоў быў старшынёю заснаванай пры СВУ спэцыяльнай арганізацыі «СУМ» (саюз украінскай моладзі). Дурдукоўскі—былы член партыі украінскіх сацыялістых-фэдэралістых. Прафэсар Гэрмайзэ—былы член партыі украінскіх сацыял-дэмакратаў, актыўны дзеяч міністэрства здароўя пры гэтмане. Сярод абвінавачаных знаходзіцца прафэсар Падгаецкі—былы член цэнтральнай рады і прафэсар Слаўчанка—былы член украінскай сацыял-дэмакратычнай партыі, капітан царскай арміі. Сярод абвінавачаных знаходзіцца таксама ўдзельнікі пятлюраўскіх паўстанцкіх камітэтаў. У суд зьявілася 9 сьведак з выкліканых 10.

Пасьля выкананьня ўсіх працэсуальных фармальнасьцяй Вярхоўны суд распачаў чытаньне акту абвінавачваньня.



У Марыупальскім парту (Украіна) выгружаюць лесаматр'ял

НОВАЯ ПАНЧОШНАЯ ФАБРЫКА



У кастрычніку 1930 г. будзе скончана будаўніцтва панчошнай фабрыкі у Віцебску. Фабрыка будзе абсталявана лепшымі амэрыканскімі машынамі. На фабрыках будзе працаваць 500 рабочых.

ТАМ, ДЗЕ БЫЛА ПУСТЫНЯ

Першы аграіндустрыяльны камбінат у Дзігоры

ГОРАД-САД У ПАЎНОЧНАЙ АСЕЦІІ

Праіснаваўшы ўсяго паўтара гады Дзігорскі агра-індустрыяльны камбінат дабіўся ўжо вялікіх посьпехаў.

У 1928 г. уся маемасьць новаарадженага камбінату — тады звычайнага калгасу — складалася з чатырох трактароў. Хутка ўдалося аб'яднаць 1.800 сялянскіх гаспадарак. Зьявілася і абагуленае стада — тысяча кароў. Потым выраслі дзьве лесапільні, цагляны завод, які выпускае мільён штук цэглы ў год.

Такім чынам калгас абярнуўся ў першы агра-індустрыяльны камбінат.

Зусім нядаўна горцы неаверліва адносіліся да бязводнай пустыні Сілтамнук. Але штучны канал з надзвычайнай хуткасьцю абвадніў пустое месца і абярнуў яго ва ўрадлівы калгас. Нядаўняя пустыня абярнулася ў край з выключна здавальняючымі ўмовамі для масавага разьвіцьця гародаў і садоў. Да гэтага часу Дзігорскі агра-камбінат сеяў, галоўным чынам, кукурузу. Цяпер вытворчае заданьне намячае пераход да гаспадаркі новага тыпу — кукурузна-малочнае з разьвіцьцём прамысловага гародніцтва, птушкаводзтва, шоўкаводзтва...

Малочная гаспадарка камбінату дае ні мала, ні многа, як 100.000 цэнтнэраў малака ў год, пры чым значная частка гэтага малака будзе кансэрвавацца. Для разьвіцьця такое малочнае гаспадаркі стала буйное рагатае жывёлы мяркуецца павялічыць да 5.000 галоў.

Горцы забылі аб бязводнай пустыні. Яны ідуць у агра-камбінат. Для іх будуецца вялікі пасёлак, які будзе абкружаны суцэльным зялёным кальцом і абярнецца ў горад-сад.

ШКОДНІЦТВА Ў ЗОЛАТАПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРЦЫ СІБІРЫ

ХАБАРАЎСК, 8. Адбыўся агульна-гарадзкі сход спэцыялістых Хабараўска. З дакладам выступіў сакратар крайкому т. Перапечка, які паведаміў пра шкодніцтва ў золатапрамысловасьці і ў лясной гаспадарцы. Допытам асоб, якія мелі дачыненьне да шкодніцтва, устаноўлены контр-рэвалюцыйныя акты і шпіёнаж. Інжынэр Сьцяпанаў, працаўнік Дальлесу Гудзім-Ляпковіч, інжынэр Агафонаў і іншыя забясьпечвалі замежных капіталістых падрабязнымі весткамі і дакумэнтальнымі данымі аб нашых багацьцях (лясной і залатой справе), перасылалі ім дэталёвыя карты, здымкі, разьведвальныя матар'ялы і г. д.

Сход пастанавіў абвясьціць дзень 15 сакавіка «днём адказу шкоднікам» (перадаўшы заработак за гэты дзень поўнасьцю ў фонд індустрыялізацыі. Сход просіць крайвыканком на сабраныя ў гэты дзень сродкі пабудаваць узорную школу-прадпрыемства, даць ёй назву—«Наш адказ шкоднікам».

Абвастрэньне ўрадавага крызісу ў Нямеччыне

ПОЛЬСКА-НЯМЕЦКАЯ ЗГОДА НАКІРАВАНА ВЫКЛЮЧНА СУПРОЦЬ СССР

БЭРЛІН, 9. Ураданы крызіс у Нямеччыне абвастраецца. Пры абмеркаваньні ў другім чытаньні законапраектаў, зьвязаных з правядзеньнем у жыцьцё пляну Юнга, рад дэпутатаў рэзка выступіў супроць некаторых умоў, у прыватнасьці супроць нямецка-польскае згоды. Паведамляюць, што міністар замежных спраў Курціус прымушаны быў на сакрэтным пасяджэньні камісіі рэйхстагу паведаміць, што ліквідацыйны дагавор з Польшчай быў падпісаны пад націскам Англіі. Выступіўшы дэпутат камфракцыі Ядаш падкрэсьліў ваенна-палітычную ролю польска-нямецкае згоды, накіраванае цалкам супроць СССР.

Адкрыўся пленум ЦКК КП(б)Б

Учора а 6-й гадз. увечары адчыніўся чарговы пленум ЦКК КП(б)Б.

Пленум першым пытаньнем заслухаў справаздачны даклад тав. Згле аб рабоце Полацкай АКК і судаклад тав. Калініна.

У спрэчках па справаздачы АКК і судакладу выказаліся т.т. Мундау і Пасюневіч.

Падрабязная справаздача аб рабоце пленуму будзе дана ў наступным нумары нашай газэты.

Пяць гадзін прастою

на Бабруйскім дозвааг ацоўч. камбінаце

БАБРУЙС

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Перавыбары парторганаў скачыстаць для яшчэ большага згуртаваньня бальшавіцкіх радоў на аснове ленінскай лініі партыі

Забясьпечыць актыўны ўдзел партыйных мас у справаздачна-перавыбарчай кампаніі

Увага перавыбарам

Да перавыбараў бюро партыйных ячэек засталося зусім мала часу. Між тым, паводле вестак з месц відаць, што падрыхтоўка да перавыбараў праходзіць далёка нездавальняюча. У рабоце значнай часткі парткамітэтаў і ячэек няма яшчэ рашучага пералому, няма ўяўленьня ўсёй палітычнай важнасьці перавыбарчай кампаніі. Многія з парткамітэтаў і ячэек пакуль што, у лепшым выпадку, абмежаваліся толькі складаньнем плянаў, вызначэньнем тэрмінаў, але нічога не зрабілі па разгортваньні сапраўднай бальшавіцкай падрыхтоўкі, па мабілізацыі ўвагі партыйных мас наўкола задач перавыбараў партыйных органаў.

Не сакрэт, што яшчэ далёка ня ўсе партыйныя ячэйкі, ня ўся маса партыйцаў азнаёмілася і прапрацавала ліст ЦК КП(б)Б на пытаньні перавыбараў парторганаў.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваім лісьце выразна вызначыў рад задач, з пункту гледжаньня выкананьня якіх павінна праходзіць уся работа па падрыхтоўцы і правядзеньні перавыбараў парторганаў.

Пасьпяховае правядзеньне гэтай важнай палітычнай кампаніі цалкам залежыць ад таго, наколькі будзе разгорнута падрыхтоўчая работа, наколькі будзе прыцягнута ўся маса партыйцаў да актыўнага ўдзелу ў абгаварэньні работы бюро ячэек.

Толькі на аснове жорсткай бальшавіцкай самакрытыкі партыйныя арганізацыі здолеюць выкрыць слабыя вучасткі сваёй работы. Адсюль задача: у часе перавыбарчай кампаніі забясьпечыць максымальна шырокі ўдзел партыйцаў і беспартыйных рабочых, батрацка-бядняцкіх мас і перадавой часткі серадняцтва ў перавыбарчай кампаніі.

У часе перавыбараў кожная ячэйка павінна дакладна праверыць сваю работу па выкананьні дырэктыў праверкомаў, праверыць, як выконваюцца вывады праверкомаў і прапановы камісіі на чыстцы па выпраўленьні хібаў і недахопаў у практычнай рабоце ячэек. У часе перавыбараў патрэбна выявіць, наколькі партыйная ячэйка на прадпрыемстве павярнулася тварам да вытворчасьці, наколькі партыйная ячэйка на вёсны перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе масавага калгаснага руху.

Камуністыя вытворчых ячэек у часе перавыбараў павінны выкрыць слабыя месцы ў сваёй рабоце, павінны праверыць сваю работу па барацьбе за прамфінплян, па перабудове партыйнай практыкі ў адпаведнасьці з задачамі гаспадарчага будаўніцтва, па наближэньні яе да вытворчасьці.

У радзе вытворчых ячэек, а таксама і савецкіх ужо распачаліся перавыбары бюро. Сёньня мы друкуем матар'ялы, якія сьпіталізуюць аб тым, што перавыбары ў некаторых ячэйках праходзяць нездавальняюча, без належнай падрыхтоўкі і без уцягненьня шырокіх працоўных мас. На чыгунцы, напрыклад, справаздачна-перавыбарчыя сходы некалькі раз зрываліся. Не адчуваецца сур'ёзнага ўважлівага падыходу да разгортваньня падрыхтоўчай работы.

Партыйныя камітэты і ячэйкі павінны безадкладна праверыць стан падрыхтоўчай работы з тым, каб правесьці перавыбары парторганаў на вышыні палітычных задач, паказаных у лісьце ЦК КП(б)Б, з тым каб скарыстаць перавыбарчую кампанію для узмацненьня ўсіх вучасткаў работы, для яшчэ большага ўзмацненьня пасьлядоўнай барацьбы з правым апартунізмам, як асноўнай небясьпекай і з «левымі» загібамі і рэшткамі трацкізму.

Ул. М-ч.

НАПЕРАКОР ПАРТЫЙНАЙ ДЫРЭКТЫВЕ

ЦК КП(б)Б і Менскі акругком далі ясныя і выразныя дырэктывы аб перавыбарах парторганаў. Перавыбары парторганаў павінны быць праведзены пры найшырэйшым удзеле батрацка-бядняцкіх мас. «Справаздачна-перавыбарчыя сходы як у гарадзкіх ячэйках, так і ў вясковых праводзіць адкрытыя, з шырокім прыцягненьнем батрацкага і бядняцкага калгаснага актыву» (з лісту ЦК КП(б)Б аб перавыбарах парторганаў).

Як-жа гэта дырэктыва праводзіцца?

6-га сакавіка адбыўся справаздачна-перавыбарчы сход у ячэйцы лямпавай фабрыкі імя «Чырвоны Кастрычнік». Сход быў... зачынены.

Калі адзін партыец выступіў супроць таго, што сход зачынены, тады прадстаўнік райкому т. Шизйдзр, якая прысутнічала на сходзе, спыніла яго, кажучы, што «такая дырэктыва райкому, а райком таксама атрымаў дырэктыву зьверху». Таксама адказаў гэтаму партыйцу і сакратар ячэйкі.

Такім чынам, на сходзе ячэйкі прысутнічала толькі ня больш 15-ці чалавек, а беспартыйная рабочая маса ня была дапушчана да сход. Ясна, што мы маем справу са скажэньнем партыйных дырэктыў аб перавыбарах парторганаў.

С.

НЯМА ПАДРЫХТОЎКІ

У МЕНСКАЙ чыгуначнай партарганізацыі падрыхтоўка да перавыбараў парторганаў разгорнута зусім слаба. З прычыны нездавальняючай падрыхтоўкі ў радзе ячэек былі сарваны справаздачна-перавыбарчыя сходы.

Парт'ячэйка службы руху і эксплёатацыі ст. Менск выпрацавала плян правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Аднак, гэтага пляну ячэйцы ажыцьцявіць ня прышлося. Практычна па падрыхтоўцы нічога ня зроблена. Плян справаздачна-перавыбарчай кампаніі сарваны. Члены бюро гэты зрыў тлумачаць тым, што сакратар ячэйкі... паехаў у камандыроўку.

Ня лепш стаіць справа і ў партыйнай ячэйцы малога рамонту ст. Менск. Тут таксама нічога ня зроблена. Перавыбары бюро павінны былі адбыцца 6-га сакавіка, але перавыбарчы сход быў сарваны. Пераважная большасьць партыйцаў чыгуначнай арганізацыі амаль нічога ня ведае аб правядзеньні перавыбараў.

М—ч.

ПАПРАЎКА

Пры ізлажэньні дакладу т. Гападзеда ў Другой частцы дакладу («Зьвязда», № 57, стар. 2. калёнка 3, у 2—3 радках зьверху) па недагляду рэдакцыі ўкраўся пропуск. За дужкай і перад словамі: «калі гаспадарка мае больш...» і г. д. трэба чытаць наступную фразу: «У аднакароўных гаспадарках малочная жывёла не абагульваецца». Далей ідзе надрукаваны тэкст.

ПАСТАНОВА ПРАВЕРКОМУ ЗАСТАЛАСЯ на ПАПЕРЫ

(Ячэйка Белдзяржстраху)

«Зьвязда» ў свой час пісала аб хваравітых зьявах, якія выявіліся ў часе чысткі партыйнае ячэйкі **Белдзяржстраху** (Менск). Праверком выкрыў буйныя скажэньні клясавае лініі ў практыцы Белдзяржстраху, факты правапартуністычнае практыкі асобных камуністых—работнікаў установы і г. д. 90 проц. членаў ячэйкі атрымалі суровыя партыйныя спагнаньні.

З моманту чысткі парт'ячэйкі Белдзяржстраху прайшло больш 5-ці месяцаў. Аднак, належнага пералому ў рабоце няма. Нават перавыбарчая кампанія парторганаў не дала пішкага зруху ў рабоце ячэйкі. Ячэйка не правяла падрыхтоўчае работы да перавыбараў бюро. Замест шырокай падрыхтоўкі бюро ячэйкі толькі абвясьціла аб часе перавыбараў.

Ня дзіва, што пасьля такое падрыхтоўчае работы на перавыбарчы сход ніхто ня прышоў з калектыву работнікаў Белдзяржстраху.

Наогул, за апошні час работа ячэйкі амаль заняпала. На працягу двух месяцаў ня склікаліся партыйныя сходы. Больш месяца, ня было ні аднаго пасяджэньня бюро. Прапановы праверкому аб узмацненьні работы ячэйкі засталіся на паперы.

П.

12-га сакавіка, а 7 гадз. увеч., у памяшканьні малай залі ЦК КП(б)Б адбудзецца чарговая нарада камуністых—работнікаў цэнтральных газэт.

На абвестцы дня пытаньні:

«ДРУК У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАМФІНПЛЯН»

Даклады рэдакцый газэт: «Зьвязда», «Віцебскі Пралетары» і «Палеская Праўда» (дакладчыкі—рэдактары газэт) і суадклады сэктар друку Культпропу ЦК КП(б)Б і ВСНГБ.

Уваход па разасланых позвах. Запрашаюцца прадстаўнікі ЦСПСБ і рэдакцый друкаваных шматтыражак.

ЗЬВЯЗДА.

Бліжэйшыя задачы Асоавіяхіму

Нядаўна скончыў сваю работу 2-гі ўсесаюзны зьезд Асоавіяхіму.

Зьезд адбыўся ў той пэрыяд, калі таварыства значна арганізацыйна і палітычна ўзмацнілася. Аднак, да гэтага часу яшчэ назіраюцца выпадкі засьмечанасьці пасобных ячэек і іх кіраўнічых органаў клясава - чужымі элемэнтамі, асабліва на вёсцы (Паўночны Край, Беларусь, Украіна, Сібір, Далёкі Усход, Урал, Заходняя краіна і інш.). У пасобных арганізацыях мела месца сувязь з прыватнікам па лініі гаспадарчай дзейнасьці. Усё гэта гаворыць аб тым, што пытаньне аб клясава-вытрыманай лініі ў рабоце павінна стаяць у цэнтры ўвагі арганізацыі таварыства.

Да зьезду канчаткова стабілізавалася 6 асноўных відаў работы а іменна: розныя віды вайсковай работы і стралковая справа, анія-работа, ВХА, хэмізацыя і с.-г. работа, агітпрапработа і навукова - дасьледчая работа. Мы маем паравальна добрыя посьпехі і ў росьце арганізацый. З 1927 году арганізацыя вырасла з 3 міл. да 5 міл. 100 тыс. і паленьнула свой сацыяльны склад. У 1928 г. было: рабочых—1.420 тыс., сялян — 1.080 тыс. і служачых — 1.000 тыс. У 1929 г. рабочых — 1.735 тыс., сялян — 1.635 тыс. і служачых — 1.170 тыс., што падкрэсьлівае рост увагі да работы таварыства з боку рабочых і бядняцка - серадняцкіх груп сялянства. Жанчын у мінулым нашым таварыстве было 17 з налов. проц., зараз —20 проц. агульнага ліку арганізацыі.

Нярэдка савецкія, прафесыянальныя і нават некаторыя партыйныя арганізацыі яшчэ далёка невыстарчальную ўвагу зварачаюць на работу нашай арганізацыі. Камсамол, які павінен быў-бы быць авангардным зьвяном Асоавіяхіму, зараз у арганізацыі прадстаўляе далёка невыстарчальны процант. Тэмпы работы Асоавіяхіму адстаюць ад агульнага тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва. Самакрытыка разгорнута невыстарчальна, сацыялістычнае спаборніцтва яшчэ далёка не зрабілася пастаянным мэтадам работы.

У мінулым кожны гурток вайсковых ведаў самастойна складаў сваю праграму і праводзіў паводле яе работу. Зараз мы маем зусім здавальняючыя праграмы, агульныя для ўсёй арганізацыі. Паводле іх і трэба будаваць работу навучальна - страйвых адзінак і гурткоў вайсковых ведаў. Трэба адмовіцца ад масавых «парадных» выхадаў. Пачынаць з адзіночнай падрыхтоўкі і паступова ісьці да першапачатковай баявой ячэйкі. Так і пабудавана зараз праграма.

Больш мэтазгодны выхад па лініі ўмацаваньня матар'яльнай базы кадраў — гэта стварэньне баз, аб'ядніваньне інструктароў і падручнікаў некалькіх ячэек, пры ўліку бесьперапынкі. Трэба поўнасьцю рэалізаваць пастанову ЦСПСБ аб вымуўленьні сродкаў з культфонду прафарганізацый на вайсковае навучаньне. Камсамол павінен павесьці рашучую барацьбу з напяваеньскімі адносінамі да абавязковага навучаньня камсамольцаў.

Нашае таварыства за мінулы пэрыяд правяло вялікую работу па аказаньні дапамогі сель. гаспадарцы. Былі арганізаваны тысячы атрадаў на барацьбе са шкоднікамі. У 1929 г. ад шкоднікаў ачышчана каля 2 міл. гэкт. зямельнай плошчы, садоў — звыш 500 тыс. гэкт. і г. д. Зараз гэту работу трэба ўсямерна пашырыць. Шпаркі тэмп калектывізацыі ставіць перад Асоавіяхімам адказную задачу — ахваціць сваёй работай увесь сацыялістычны сэктар, стварэючы базу буйных калгасаў, падрыхтоўваючы там адпаведныя кадры.

Пяцігодка дасьць нам каля 120 міл. на практычную работу. За гэты час таварыства павінна вырасьці больш, як у 4 разы. Кожная ячэйка павінна ўзяцца за ажыцьцяўленьне гэтых задач. Гэтага патрабуе ад нас міжнародная абстаноўка, ліхаманкавая падрыхтоўка імпэрыялістых да нападу на Савецкі Саюз. Мы павінны быць гатовы да адпору.

Я. ВАСІЛЕВІЧ.

Агонь па вялікадзяржаўным шавінізьме

Не дамо зрываць беларусізацыю

ДАБ'ЕМСЯ ПОЎНАЙ РАШУЧАЙ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ САВЕЦКІХ УСТАНОЎ

Узмоцнім тэмпы беларусізацыі на фабрыках і заводах

УЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ

Факты сьпіталізуюць аб тым, што ў радзе месц ёсьць зусім паяўнае паслабленьне барацьбы з вялікадзяржаўным расійскім і іншымі шавінізмамі. Дзе-ні-дзе над мімікрыяй, пад рознымі шыльдачкамі вялікадзяржаўны шавінізм імкнецца працягнуць свае ідэйкі, пераходзіць у наступленьне.

Асабліва моцную атаку расійскія шавіністыя вядуць супроць беларусізацыі. У анапімных анкетах, якія былі праведзены ЦБ пралетстуду, некаторыя студэнты пішуць: «У сувязі з тым, што мы імкнемся да інтэрнацыянальнай мовы, дык беларуская мова зьяўляецца кроцам да першабытнасьці. Шматмоўе зьяўляецца бічом чалавецтва, а таму чалавецтва пад напорам чалавечых неабходнасьцяй стыхійна імкнецца да інтэрнацыяналізацыі мовы».

У Віцебскім вэтінстытуце сярод студэнтаў маюць месца такія-ж разважаньні наконт беларусізацыі. Прыклады падобных думак ёсьць і ў студэнцтва ў Віцебскім палітэхнікуме, і ў каапэрацыйным тэхнікуме, і на рабфаку. Ёсьць у навучальных установах шматлікія выпадкі сабатажу беларусізацыі, што таксама трэба разглядаць, як праявы расійскага шавінізму.

І трэба сказаць, што зусім слаба даецца адпор гэтым праявам.

Ва многіх установах і арганізацыях і дагэтуль заўважваюцца лёгкадумныя адносіны да фактаў зрыву беларусізацыі. Аб гэтым гаворыць ніжэй зьмешчаны матар'ял аб праверцы ведаў беларускай мовы сярод служачых установаў па Брагінскім раёне ў Гомельшчыне. Там поўнасьцю сарвалі дырэктыву партыі і савецкай улады аб беларусізацыі. **З 119 праверваных асоб, толькі 38 ведаюць беларускую мову.** Кіраўнікі ўстаноў, у тым ліку і партыйцы, ня толькі ня прымалі ніякіх захадаў да беларусізацыі ўстановы, але і самі ня вывучылі беларускай мовы. Гэта зусім недапушчальна. Трэба рашуча ўзьдзейнічаць на тых, якія зрываюць беларусізацыю, хто ня хоча ва ўстановах вывучаць беларускую мову. Трэба зьнімаць з працы тых, хто злосна ня выконвае дырэктыў партыі і савецкай улады аб беларусізацыі. Партыйныя, прафсаюзныя і інш. арганізацыі павінны зрабіць рэзкі пералом у адносінах павышэньня тэмпу беларусізацыі ўстаноў.

Змагаючыся з беларускім нацыяналдэмакратызмам, як найбольш небясьпечным на даным этапе, мы ні на хвіліну не павінны паслабляць бязьлітаснай барацьбы з актывізуючымся вялікарасійскім і інш. шавінізмамі.

Беларусізацыя—магутная зброя ў гэтай барацьбе на два франты. Мы павінны ўзмацніць тэмп беларусізацыі —аднаго з асноўных сродкаў узмацненьня кіраўніцтва пралетарскага гораду вёскай. Мы павінны жорстка караць тых, хто зрывае беларусізацыю.

А. С.

ПОЎНЫ ЗРЫЎ

Нядаўна па ўстановах Брагінскага раёну (Гомельшчына) адбылася праверка ведаў беларускай мовы. Яна паказала недапушчальны зрыў усіх партыйных дырэктыў па беларусізацыі.

На праверку ня прышла вялікая частка працаўнікоў. З 60 працаўнікоў апарату Брагінскага спажывецкага таварыства, прышло ўсяго 9. Ня прышлі старшыня райкалгассаюзу Пляшчанка і райаграном Гарленка.

Вялікая колькасьць кіраўнікоў устаноў не адчувае адказнасьці за правядзеньне беларусізацыі ў сябе ва ўстанове, а адсюль і слабое яе правядзеньне. Так, былое праўленьне Брагінскага спажывецкага т-ва ніякіх мер ня прымала для правядзеньня беларусізацыі, і вось аказалася, што з 9 праверваных асоб, толькі адзін ведае беларускую мову. Бухгальтар Каганскі, хаця фармальна беларускую мову і вывучыў, але не жадае яе ўжываць з мэтаю абслугоўваньня насельніцтва.

У апараце міліцыі з 8 працаўнікоў ведаюць беларускую мову — 2. Начмілі цыі ня толькі ня прыняў ніякіх захадаў да беларусізацыі ўстановы, але нават і сам ня ведае беларускае мовы.

З 6-ці працаўнікоў пошты ня ведаюць беларускае мовы 3. Рэшта — нават зусім не жадае вывучаць «мужыцкае мовы». Загадчык пошты Чарняцоў гэтай справай ня цікавіўся.

У апараце больніцы і вэтвучастку і ня чуваць пра беларусізацыю. Загадчык гэтых устаноў, ня гледзячы на вызначаныя тэрміны, сам ня ведае беларускае мовы. Працаўнікі з курсаў снурсындыкату «не интересуются белорусским языком». Рахункавод Гурэвіч Лазар «не имел к этому делу стремления». Былы бухгальтар шавецкай арцелі нават варожа адносіўся да беларусізацыі. У сельска-гаспадарчым таварыстве з 7 працаўнікоў, ведаюць мову 3. Кіраўнік гэтай установы Вераб'ёў ня прымаў ніякіх мер да беларусізацыі ўстановы.

Той-жа самы малюнак і ў райвыканкоме. Тое-ж самае і ў сельсаветах. Нацкамісія праверыла каля 23 устаноў.

Прайшло праверку 119 асоб, з якіх аказаліся падрыхтаванымі для працы на беларускай мове 38 асоб. Нацкамісіяй абвешчана суровая вымова 30 працаўнікам.

Вынікі праверкі гавораць аб тым, што сярод членаў прафарганізацый, а таксама і партыйнай арганізацыі не вядзецца ніякай працы па растлумачэньні пытаньняў беларусізацыі. Партыйцы, якія працуюць па ўстановах, ня ведаюць беларускае мовы і ня прымаюць ніякіх мер да беларусізацыі сваіх устаноў. Няма гурткоў па вывучэньні беларускае мовы.

Трэба склікаць нараду загадчыкаў устаноў, азнаёміўшы іх са становішчам беларусізацыі па раёне, запатрабаваць ад іх прыняцьця патрэбных мер па поўнай беларусізацыі сваіх устаноў. Трэба дабіцца ня толькі пераводу пісьмовай работы на беларускую мову, але і ўжываньня гэтай мовы ў гутарцы, асабліва з наведвальнікамі ўстаноў.

ВЯСКОВЫ.

На рэйкі ўдарнасьці

Ва ўсіх камсамольскіх ячэйках (Залінейны раён, Гомельшчына) праведзены сходы з дакладамі аб чарговых задачах беларусізацыі і барацьбы з расійскім шавінізмам і беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

Па ячэйках склалі ўдарныя брыгады для вывучэньня беларускае мовы: у ячэйцы заводу імя Ланцуцкага—дзьве брыгады (50 чал.); на 9-м вучастку сл. цягі—1 брыгаду; у будаўнікоў—1 брыгаду. Пасобныя ячэйкі выклікалі адна адну на сацспаборніцтва па вывучэньні беларускае мовы, розныя абвесткі і паведамленьні ў праўленьні і крамах вывешваецца пераважна на расійскай мове.

Зараз пры адсутнасьці актыўнага супраціўленьня правядзеньню беларусізацыі ў некаторых установах, ёсьць выпадкі пасыўнага супраціўленьня, якое выяўляецца ў няўжываньні жывое беларускае мовы на рабоце ва ўстанове. Ёсьць выпадкі фармальных адносін да вывучэньня беларускае мовы. У некаторых акруговых установах, аддзелах і інспэкцыях АВК ёсьць работнікі, якія і да гэтага часу складаюць паперы на расійскай мове, даюць іх перакладаць на беларускую машыністкам пры надрукаваньні.

У свой час бюро ЦК КП(б)Б дало дырэктыву ўстановам, каб апошнія, побач з узмоцненым пераводам работы апарату на беларускую мову, ні ў якім разе не паслаблялі сваёй увагі да абслугоўваньня працоўных іншых нацыянальнасьцяй БССР на іх роднай мове. У выкананьні гэтае дырэктывы ёсьць значныя посьпехі. Але ёсьць такія ўстановы, якія ня выкавалі гэтае дырэктывы.

П. ЯГАЎДЗІК.

Фармальна

Паводле адпаведных дырэктыў, беларусізацыя ўсяго дзяржаўнага, прафесыянальнага, гаспадарчага і каапэрацыйнага апарату у Менскай акрузе павінна была быць скончана да 1-га ліпеня 1927 году. У асноўным гэта дырэктыва партыі і ўраду па Менскай акрузе выкананa толькі з пункту погляду пераводу пісьмовае работы (справаводзтва) устаноў на беларускую мову. Што-ж датычыць паляпшэньня якасьці беларускае мовы, ужываньня яе ў гутарцы, дык у гэтай частцы трэба жадаць шмат лепшага.

У цэлым радзе ўстаноў якасьць беларускае мовы надта нізкая. У менскай акруговай паштовай канторы сувязі, МЦРК, акрадпраўленьні Белкаапсаюзу беларуская мова зьяўляецца рэдкім госьцем. МЦРК, напрыклад, перавёўшы цалкам справаводзтва і рахункаводзтва на беларускую мову, розныя абвесткі і паведамленьні ў праўленьні і крамах вывешвае пераважна на расійскай мове.

Зараз пры адсутнасьці актыўнага супраціўленьня правядзеньню беларусізацыі ў некаторых установах ёсьць выпадкі пасыўнага супраціўленьня, якое выяўляецца ў няўжываньні жывое беларускае мовы на рабоце ва ўстанове. Ёсьць выпадкі фармальных адносін да вывучэньня беларускае мовы. У некаторых акруговых установах, аддзелах і інспэкцыях АВК ёсьць работнікі, якія і да гэтага часу складаюць паперы на расійскай мове, даюць іх перакладаць на беларускую машыністкам пры надрукаваньні.

У свой час бюро ЦК КП(б)Б дало дырэктыву ўстановам, каб апошнія, побач з узмоцненым пераводам работы апарату на беларускую мову, ні ў якім разе не паслаблялі сваёй увагі да абслугоўваньня працоўных іншых нацыянальнасьцяй БССР на іх роднай мове. У выкананьні гэтае дырэктывы ёсьць значныя посьпехі. Але ёсьць такія ўстановы, якія ня выкавалі гэтае дырэктывы.

П. ЯГАЎДЗІК.

РОЛЯ ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ І НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ У САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

Даклад тав. ГАЛАДЗЕДА на канфэрэнцыі інжынэрна-тэхнічных і навуковых працаўнікоў 6-га сакавіка 1930 г.

Сучасны пэрыяд нашага сацыялістычнага будаўніцтва можа характарызавацца, як вялікі гістарычны паварот у ходзе разьвіцьця Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мы зьяўляемся ня толькі сьведкамі, але і непасрэднымі ўдзельнікамі вялікае ломкі старых вытворчых адносін у сельскай гаспадарцы, старога быту, вялікае ломкі ўкаранелых у працоўным сялянстве вякамі традыцый уласьніцтва. Тое, што мы сёньня маем у Беларусі каля 70 проц. калектывізаванай пахаці, гаворыць аб тым, што мы за апошні год. асабліва за апошнае паўгодзьдзе, зрабілі такі вялікі крок наперад у разьвіцьці сацыялізму, што многія таварышы яшчэ нядаўна і ня марылі аб такой магчымасьці.

Ці выпадкова гэта, што мы маем такія вялізарныя посьпехі, ці не?

Дакажучы аб'ектыўным умовам і мерапрыемствам партыі і ўраду, асноўная маса бядняцка-серадняцкага сялянства як у БССР, так і ва ўсім Саюзе рушылася на шляху ператварэньня сельскае гаспадаркі на новых сацыялістычных падставах.

Мне думаецца, што ў гэты пэрыяд сапраўднага эканамічнага перавароту на вёсны, пэрыяд, які цягне за сабою такі-ж сапраўдны пераварот у быце і ў псыхалёгіі мільённых мас сялянства, усім нашым навуковым і культурным працаўнікам, інжынэрам і іншым спэцыялістым як сельскае гаспадаркі, так і прамысловасьці, трэба сур'ёзна паставіць перад сабою задачу быць ня толькі сьведкамі, але і актыўнымі, перадавымі ўдзельнікамі гэтага вялікага гістарычнага будаўніцтва сацыялізму, якое зараз праводзіцца на нашых вачох і з удзелам многіх з вас.

Гэта зараз асноўнае пытаньне, якое павінна стаяць перад кожным спэцыялістым. Чаму, таварышы, я стаўлю так пытаньне? Таму, што, ня гледзячы на высокія тэмпы нашага будаўніцтва, ня гледзячы на нябывалы ў гісторыі разьвіцьця чалавецтва спэцыяльна эканамічны, тэхнічны і псыхалёгічны пераварот у мільённых масах сялянства, усё-ж такі гэтыя посьпехі маглі быць яшчэ большымі, калі-б уся вялікая армія спэцыялістых, якая працуе ў нашых савецкіх установах — і на лініі прамысловасьці і сельскае гаспадаркі— уся, як адзін, працавала на карысьць сацыялізму. На вялікі жаль, разам са значнаю часткаю цалкам адданых справе пралетарыяту тэхнічных працаўнікоў-інжынэраў, спэцыялістых, прафэсуры, культурных і іншых працаўнікоў, ёсьць яшчэ рад такіх спэцыялістых, якія ня толькі тармазілі пасьпяховы ход сацыялістычнага будаўніцтва, а і ставілі перад сабою задачу ліквідаваць дыктатуру пралетарыяту і рэстаўраваць капіталістычны лад.

Вось на гэта мне і хочацца зьвярнуць увагу. Ці ёсьць сярод такіх людзі, якія імкнуліся і цяпер імкнуцца да рэстаўрацыі дыктатуры буржуазіі замест дыктатуры пралетарыяту? Так, ёсьць і іх нямала ў нашай дзяржаве. Ня гледзячы на тое, што ў мяне ёсьць досыць матар'ялаў, якія сьведчаць аб тым, што робіцца ў саюзных установах і іншых рэспубліках такімі арганізацыямі спэцыялістых, якія займаюцца контр-рэвалюцыяй і шкодніцтвам, аб гэтым я вам гаварыць ня буду таму, што ў дакладзе тав. Рыкава і ў артыкулах т.т. Куйбышаўскага, Куйбышава і Крыленка вы маглі знайсьці досыць матар'ялаў, з якіх відаць, што робіцца пасобным шкодніцкімі арганізацыямі і шкодніцкімі элемэнтамі ў нашых савецкіх установах, у важнейшых галінах сацыялістычнага будаўніцтва. З гэтых апублікаваных ужо матар'ялаў відаць, што ў важнейшых галінах нашае прамысловасьці сыстэматычна працавалі шкодніцкія, контр-рэвалюцыйныя арганізацыі, як напрыклад: у мэталёвай прамысловасьці, у горнай, у золата-плятынавай, ваенная, хэмічная і г. д. і што гэтыя контр-рэвалюцыйныя шкодніцкія арганізацыі былі зьвязаны з замежнымі капіталістычнымі дзяржавамі і фірмамі і на іх сродкі працавалі.

Калі ў нас, у БССР, гавораць аб нёбаходнасьці барацьбы са шкодніцтвам, то ўсе прывыклі спасылацца на аддаленыя па месцы прыклады, як шахцінскі працэс, украінскую контр-рэвалюцыйную арганізацыю, якая цяпер стала перад пралетарскім судом, і інш., а каля сябе мы іншы раз ня імкнемся пашукаць такіх-жа шкоднікаў. Вось я і хачу ў маім дакладзе якраз і сказаць вам аб тым, што патрэбна вам тут на месцы, каля сябе, пакапацца, як сьлед, і можна знайсьці сёе-тое, што трэба выгнаць, безадкладна выцьвярнуць са сваіх радоў. Таму я спынюся толькі на тым, што робіцца ў нас пад носам, у самой Беларусі. Ці зьяўляецца Савецкая Беларусь выключэньнем у сэнсе наяўнасьці шкодніцкіх арганізацый і зьяўніч? Ёсьць яны ў нас, ці не?

Шкодніцтва ў БССР

На вялікі жаль, Беларусь не зьяўляецца выключэньнем, і ў нас па ўсіх галінах народнае гаспадаркі працавалі (трэба меркаваць, што і зараз яшчэ ня ўсіх мы выявілі) ня толькі пасобныя шкодніцкія элемэнты, але і цэлыя шкодніцкія арганізацыі; часткова мы іх выявілі, а тых, якіх не злавілі, думаем, што і іх адловім.

Вось возьмем мы прамысловае будаўніцтва. Вы ведаеце, што асноўнаю задачаю савецкае ўлады і кампартыі БССР зьяўляецца тое, каб нашу Савецкую Беларусь — дробна-сялянскую, саматужную — ператварыць хаватку хоць-бы ў індустрыяльна-аграрную краіну. Адсюль канкрэтная задача: мабілізаваць усю ўвагу, сродкі і энэргію людзкую і тэхнічную для разьвіцьця прамысловага будаўніцтва. Але вось, ня гледзячы на гэту лінію, якую мы зараз рашуча праводзім, ёсьць людзі, якія ўжываюць усякія захады, каб сарваць гэтыя пачынаньні пралетарыяту БССР і савецкага ўраду.

Возьмем, напрыклад, папяровую прамысловасьць БССР. Выяўляецца, што там усе гады было ня зусім добра ў гэтым сэнсе, вірней, зусім нядобра. Вось што паказвае былы галоўны інжынэр папяровага трэсту Будбэрг, які, мусіць, гэтаму сходу вядомы і якога мы ўжо арыштавалі. Ён паказвае наступнае:

«Лічу сябе вінаватым у тым, што з часу злучэньня з Палескім трэстам, г. зн. з лета 1928 г., пачаў праводзіць шкодніцкую дзейнасьць у трэсьце і на прадпрыемствах, накіроўваючы яе: напершае, на затрыманьне новага будаўніцтва (як пашырэньне існуючых прадпрыемстваў, так і хутчэйшае ажыцьцяўленьне пабудоў нанава вызначаных), падругое, на затрыманьне капітальнага рамонту, аднаўленьня і пашырэньня асобных галін вытворчасьці для максымальнага іх скарыстаньня і паляншэньня; патрэцяе, на ўнутрытрэстаўскую арганізацыю, г. зн. канцэнтрацыю ў сваіх руках як галоўнай ініцыятывы, так і ажыцьцяўленьня ўсіх асноўных пытаньняў вытворча-тэхнічнага аддзелу, а роўна і пытаньняў тэхнічнага забясьпячэньня».

Бачыце, таварышы, наша партыя, савецкая ўлада, пралетарыят, а пад яго кіраўніцтвам і лепшая частка інжынэрна-тэхнічных і культурных працаўнікоў напружваюць усе сілы і сродкі для таго, каб паскорыць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, а Будбэргі і ім падобныя зрываюць гэтае будаўніцтва, канцэнтруюць у сваіх шкодніцкіх руках усю мэханіку папяровае вытворчасьці для зрыву ўсялякіх пачынаньняў у гэтай галіне.

Чым-жа ён тлумачыць сваю шкодніцкую дзейнасьць? А вось што ён з гэтага поваду кажа:

«... Правільным вырашэньнем пытаньня было-б, на маёй думцы, ставіць на чале прадпрыемстваў асоб з дастатковай тэхнічнай па данай спэцыяльнасьці падрыхтоўкай. Паколькі выраішэньне гэтага пытаньня зьявілася немагчымым, а вынікі работы прадпрыемства вялі да рэгрэсу, то як пабудзкальчае мерапрыемства ў довад гэтага было яшчэ большае тармажэньне эфэктаў і паглыбленьне супярэчнасьцяй, якія вызначаліся, шляхам шкодніцкай дзейнасьці, абвалакаючы ня ў форму аб'ядніваньня.

Падзеі маглі быць паскораны і выкананьне было-б аблегчана.

Паслабленьне работы прадпрыемства, як вынік шкодніцкай дзейнасьці, прыводзячы да развалу фабрыку і да нездавальненьня рабочых, зьявілася-б довадам верхавінам няправільнага даручэньня кіраўніцтва непалыходзячаму выканаўцы і прывяло-б да няўхільнасьці перагляду і зьмяненьня існуючага парадку кіраваньня прадпрыемствамі шляхам замежнага ўмяшаньня ў тай ці іншай форме, прычым гэтае замежнае ўмяшаньне падразумявае я ў форме або напасрэднага захвату дзяржаўнай улады шляхам інтэрвэнцыі, або, як забраньне прадпрыемстваў у канцэсію, або, урэшце, як пераход існуючага дзяржаўнага паду на далушчэньне прыватнай уласнасьці».

Вы думаеце, што ён толькі абмяжоўваўся тым, што зрываў вытворчасьць нашых фабрык і заводаў? Не, таварышы, няма такога чудакаватага шкодніка, які-б шкодзіў толькі для таго, абы шкодзіць. Як і ва ўсялякага шкодніка, так і ў даным выпадку і ў Будбэрга за шкодніцтвам у вытворчасьці хаваецца асноўная і галоўная ідэя: зьвяржэньне існуючай дзяржаўнай улады.

Вось як стаіць пытаньне. Я, таварышы, ня буду вам многа цытаваць, хоць ёсьць вельмі цікавыя паказаньні яго. Я ўжо вам казаў, што гэты Будбэрг ужо арыштаваны і сядзіць у належным месцы. Але і з гэтых цытат вы бачыце, што Будбэрг ня згодны з тым, што нашай сацыялістычнай прамысловасьцю, як і ўсёй дзяржавай, кіруе пралетарыят, які, па думцы Будбэрга, ня мае належнай тэарытычнай падрыхтоўкі. У гэтым асноўнае пытаньня. Будбэргі ня могуць ніколі прымірыцца з такім становішчам, каб імі кіраваў рабочы Якабсон, аб чым Будбэрг прызнаецца ў сваіх паказаньнях, або другі пралетар. Гэта, таварышы, нянова і невыпадкова.

Гэта ня толькі думка аднаго Будбэрга; я магу вам расказаць прыклад са сваёй практыкі і аб іншых падобных да Будбэрга. Я сам, як і тав. Якабсон (былы дырэктар папяровага трэсту), быў у такой скуры калісьці, калі быў пушчаны памфлет у адной паважанай установе, што «церковно-приходская школа поведила ВУЗ». Гэта было сказана асобай, падобнай да Будбэрга, з прычыны таго, што мяне выбралі членам праўленьня аднаго ВНУ.

Вось такія ворагі пралетарыяту і хацелі прывесьці да таго, што нашы тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва маглі быць сарваны, калі-б вока пралетарыяту не сачыла за гэтымі прахвостамі. У выніку дзейнасьці шкодніцкай арганізацыі папяровай прамысловасьці БССР было цэлы рад аварый на фабрыках, не гаворачы ўжо аб зрыве і зацяжцы будаўніцтва і рэканструкцыі. Для прыкладу паслухайце наступнае:

«Галоўную прычыну, — паказвае Будбэрг, — аварыі маста ў Добрускай фабрыцы ў жніўні 1929 году было няпрыняцьце ў ранейшыя гады мер да рамонту вадабойнага і сплаўнога молу, які

Толькі 52%

Тэмп зямляўпарадкаваньня слабы

З агульнай плошчы зямель арганізаваных на 1-га сакавіка калгасаў у 4.690 тыс. гэкт. афармлена зямляўпарадкаваньнем 2.496 тыс. гэкт., або 52,1 проц. Тэмп работ па зямляўпарадкаваньні за апошнюю дэкаду некалькі павысіўся: за дзесяцідзёўку з 20-га лютага па 1-га сакавіка зямляўпарадкавана плошча ў 663.000 гэкт. супроць 565.000 гэкт. за папярэднюю дзесяцідзёўку. Павялічыліся і суадносіны паміж зямляўпарадкаванай плошчай і агульнай калектывізаванай плошчай — на 20-га лютага зямляўпарадкаваная плошча складала 40 проц. усёй калектывізаванай плошчы, а на 1-га сакавіка гэтыя суадносіны павялічыліся да 52 проц.

На першым месцы па колькасьці зямляўпарадкаванай плошчы калгасаў ідзе Меншчына (75 проц.); на другім — Мазырская акруга (66 проц.), Віцебская і Бабруйская акругі—плятуцца ў хвасьце.

Апошняя пастанова СНК БССР гаворыць аб тым, што да 1-га красавіка неабходна зямляўпарадкаваць (з разьбіўкай на палі і ўказаньнем яравога кліну) усе калгасы арганізаваныя да 15-га сакавіка. Для таго, каб выканаць гэту пастанову ўраду і аформіць зямельную плошчу калгасаў да пачатку веснавой сяўбы, трэба ў максымальнай ступені сьпяшацца з работай па зямляўпарадкаваньні.

Л. Н.

Загад аб адгрузцы по пелу ня выконваецца

ПАСТАНОВЫ ГАРСАВЕТАЎ ЗАСТАЮЦЦА НА ПАПЕРЫ

Да пачатку веснавое сяўбы па БССР трэба сабраць 22.000 тон поцелу, сабрана-ж 10.390 тон, або 43 проц. заданьня. Калі збор поцелу і надалей будзе ісьці такім тэмпам, то ясна, што заданьне будзе праваленa. Ні адна акруга ня выконвае катэгарычнага загаду аб неадкладнай адгрузцы поцелу на балотныя масывы. Між тым, уся адгрузка павінна быць скончана да 1-га красавіка.

Віцебск замест таго, каб яшчэ ў канцы лютага пачаць адгрузку 35 вагонаў поцелу камуне БВА, пачаў спрачацца і адмаўляецца выконваць загад. Не дапамагае і паўторны катэгарычны загад. **Віцебск не адгрузіў яшчэ ні аднаго вагону.**

Полацак павінен адгрузіць на Наўліцкія балоты каля 20 вагонаў, але пакуль што нічога не адгружана.

Праводзіць работу, хаця і невыстарчальна, Бабруйск, які адгрузіў 5 вагонаў поцелу камуне БВА замест 35 вагонаў.

Трэба адзначыць, што грамадзкасьць прымае вельмі слабы ўдзел у гэтай важнай справе. Многія ЖАКТы, камгаскія дамы і нават прадпрыемствы не прыступілі да збору поцелу. Па многіх жактах і, у прыватнасьці, у Менску абмежаваліся толькі ўстаноўкай скрынак і на гэтым супакоіліся. Усялякія пастановы гарсаветаў аб штрафаваньні і прыцягненьні да адказнасьці за нязьбіраньне поцелу, застаюцца толькі на паперы. Ніхто не штрафуецца і ня прыцягваецца да адказнасьці.

Менскі гарсавет не праверыў, як выконваецца яго дырэктыва аб зборы поцелу.

ПРАЦА УПУСТУЮ

Рабочыя пляны складаюцца ў габінэтах

На 5-га сакавіка па Асьвейскім раёне, Полацкай акругі, зямляўпарадкавана 10.290 гэкт. зьнельнае плошчы калгасаў. Незямляўпарадкаванымі, засталіся 19 калгасаў на плошчы 12.210 гэкт.

Каморнікі працавалі на падставе такое дырэктывы: абмяжоўваць плошчу калгасаў у разьмеры 1.500 гэкт., выходзячы з мясцовых умоў. Аднак, 5-га лютага каморнікі атрымалі другі абежнік ад акрвыканкому, якім прапанавалася спыніць зямляўпарадкаваньне па ранейшых нормах і праводзіць абмежаваньне калгасаў у разьмеры ад 1.500—3.500 гэкт. Такім чынам, праца па афармленьні 15 калгасаў была зроблена ўпустую. Прыходзіцца перарабляць яе. І гэта ў той час, калі сяўба ўжо не за гарамі.

Вытворчыя пляны ўжо ёсьць у калгасах, але яны мала канкрэтны, а тае прычыны, што складаліся ў габінэце райкалгасаюзу, бяз уліку ўмоў кожнага калгасу.

Вытворчыя пляны складзены, напрыклад, без уліку таго, колькі ў калгасе ёсьць у наяўнасьці сродкаў вытворчасьці, рабочае сілы, рабочае жывёлы, чаго не хапае. У выніку, у арганізацыйную працу калгасаў унесена блытаніна, яны ня ведаюць, як будаваць свае рабочыя пляны.

Зараз 3 аграномы - студэнты прыступілі ў раёне да выпрацоўкі рабочых плянаў калгасаў. Ужо цяпер можна сказаць, што гэты габінэтны мэтад выпрацоўкі рабочых плянаў ня дасьць магчымасьці зрабіць іх сапраўды рэальнымі. Рабочы плян калгасу павінен складацца, выходзячы з яго балянсу кожнае культуры, вызначанага ў вытворчым пляне. Між тым, балянс культур ня вызначаны ні ў адным калгасе.

Раённыя арганізацыі апраўдваюць адсутнасьць рэальных вытворчых і рабочых плянаў калгасаў тым, што яшчэ ня скончана зямляўпарадкаваньне. Гэткае апраўданьне, аднак, ня вытрымлівае крытыкі, бо 15 калгасаў ужо зямляўпарадкавана і для іх даўно можна было выпрацаваць вытворчыя і рабочыя пляны. **Аграномы-ж лічаць за лепшае сядзець у раёне і складаць пляны калгасаў у габінэтах, а не рабіць іх непасрэдна ў калгасе.**

Брыгадзір «Зьвязды» ХАЛЯВІН.

КАЛГАСНАЯ СЫСТЭМА ЗАБЫЛА АБ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

Катастрафічнае становішча са спагнаньнем запазычанасьці і паёў

Са спагнаньнем запазычанасьці і пазапакапленьнем па сельска-гаспадарчай крэдытнай сыстэме справа стаіць катастрафічна.

Тэрміновых плацяжоў — замест 5.500.000 руб. паступіла толькі 4.419.000 руб.—76,6 проц. заданьня. Па Віцебскай акрузе замест 900.000 руб. паступіла ўсяго 519.000 руб.

Выключна дрэнна стаіць справа з пратэрмінаваньнямі. На 1-га кастрычніка яны складалі 1.352.000 руб., а на 1-га лютага гэтая сума вырасла да 1.920.000 руб. Пратэрмінаваньні ў некаторых акругах вырасьлі да вельмі высокіх сум. У Полацкай акрузе яны зараз, у параўнаньні з кастрычнікам, вырасьлі на 168 проц., у Мазырскай —па 63 проц. і ў Менскай—па 57 проц.

На працягу першага кварталу павінна было паступіць 750.000 руб., паступіла-ж усяго на сёньняшні дзень 145.800 руб.—22,4 проц. пляну. У некаторых акругах паступленьне паёў ідзе яшчэ горш.

Дырэктыва аб спагнаньні запазычанасьці з кулакоў не праводзіцца ў жыцьцё і ня выканана ні ў адным з акруг. Не спагнана таксама запазычанасьць з іджэ-калгасаў, якая дасягае да 40.000 руб. Па некаторых крэдытных таварыствах кулацкая запазычанасьць дасягае вялізарных сум. Наглядаюцца выпадкі невыкананьня дырэктыў аб незвароце паёў кулаком.

Найбольш адстаюць у справе спагнаньня запазычанасьці і збору паёў акругі суцэльнай і інтэнсыўнай калектывізацыі—Мазырская, Магілёўская і Віцебская.

Кіраўнікі амаль усіх акруговых калгассаюзаў і праўленьняў калгасаў ня лічаць сваім абавязкам прыняць меры да мабілізацыі сродкаў па запазычанасьці, якая лічыцца за калгасьнікамі. Ня гледзячы на ясныя дырэктывы партыі па гэтым пытаньні, мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі не зьвярнулі да гэтага часу нішчае ўвагі на пытаньне мабілізацыі сродкаў насельніцтва па пасьпяховае выкананьне пасеўнай кампаніі. Месцы забылі, што кредытныя таварыствы шляхам мабілізацыі сродкаў насельніцтва павінны даць на пасеўную кампанію да 6.100.000 руб.

Маем рад выпадкаў ва ўсіх акругах, калі да гэтага часу некаторыя кіраўнікі мясцовых арганізацый і калгасаў не пакрылі сваёй асабістай запазычанасьці крэдытным таварыствам. Прыклад такіх «актывістых» адмоўна ўплывае на калгасную масу.

Мабілізацыя сродкаў—спагнаньне запазычанасьці і збор паёў—павінна стаць адным з аспэктных задач падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі. Сярод груп беднаты павінна быць праведзена шырокая растлумачальная работа.

Неабходна зараз-жа шырока разгарнуць кампанію за збор дыфэрэнцыянага наёму як сярод калгасьнікаў, так і індывідуальных гаспадарак.

З тымі, што тармозяць і зрываюць пасьпяховае спагнаньне запазычанасьці, павінна быць праведзена рашучая барацьба, ня спыняючыся перад партыйнымі і судовымі спагнаньнямі.

А.

НЕАДКЛАДНА УЗМОЦНІЦЬ ТЭМП АБАГУЛЕНЬНЯ

рабочае скаціны

Паводле вестак Белкалгасцэнтру, на 1-га сакавіка заданьне па абагуленьні рабочай скаціны ў БССР выканана толькі на 37 проц. (абагулена 177.185 коняй).

У прыватнасьці, Менская акруга выканала 30,3 проц. заданьня, Бабруйская — 42,7 проц., Полацкая — 27,6 проц., Віцебская — 33,8 проц., Аршанская — 40 і Магілёўская — 38,8 проц.

ЗАМЕСТ ЖЫВОЕ ПРАЦЫ ЦЫРКУЛЯРЫ І ПЛЯНЫ

Арганізацыя адыходніцтва на паперы

У мінулым годзе на сэзонных работах па БССР было занята 152.000 чалавек. Сёлета патрабуецца каля 250.000 рабочых. З іх будаўнікоў 102.000, с.-г. рабочых—7.500, сплаўшчыкаў і інш. лясных рабочых — 100.000, гарнякоў — 16.000, фабрычна-заводзкіх рабочых — 13.000 — на 68 проц. больш, чым у мінулым годзе.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што пытаньні арганізацыі адыходніцтва павінны былі заняць асабліва сур'ёзнае месца ў рабоце органаў працы і калгассаюзаў.

Але замест напружанай работы па арганізацыі рынку працы, ёсьць толькі цыркуляры і пляны.

Уся арганізацыя адыходніцтва ў калгасах сёлета будуецца на падставе згод органаў Наркампрацы і праўленьняў калгасаў. Ёсьць катэгарычная дырэктыва—скончыць заключэньне гэтых згод да 1-га красавіка, а расклад адыходніцтва давесьці да пасобных калгасаў у 10-цідзённы тэрмін. Праўленьне Белкалгасцэнтру па сваёй лініі прапанавала скончыць улік рабсілы ў калгасах да 15-га сакавіка.

Весткі, якія ёсьць у нашым распараджэньні, сьведчаць аб тым, што на гэтым важным вучастку далёка ня спрыяючае становішча, якое пагражае сур'ёзным правалам.

Белкалгасцэнтр расклаў адыходніцтва па акругах, даў формы блянкаў для ўліку рабсілы і на гэтым супакоіўся. Зараз Белкалгасцэнтр нічога ня ведае, што-ж робіцца на мясцох і як выконваецца яго дырэктыва. Пляны адыходніцтва да пасобных калгасаў не даведзены. Акруговыя арганізацыі марудзяць з заключэньнем згод. Зусім слаба наладжана растлумачальная работа. Калгасная маса і асабліва жанчыны ня ведаюць умоў і парадку адыходніцтва ў гэтым годзе. Ня выяўлены пакуль што новыя раёны адыходніцтва.

Прафсаюзныя арганізацыі абяцалі паказваць у калгасы рабочыя брыгады для дапамогі ў правядзеньні работы па арганізацыі адыходніцтва і складаньня балянсаў працы. Але гэтых брыгад яшчэ няма.

Калі ў рабоце па арганізацыі адыходніцтва ў бліжэйшыя дні ня будзе зруху, то мы станем перад сур'ёзнай пагрозай зрыву раду важных работ з-за адсутнасьці патрэбнай рабочай сілы.

Прафсаюзы ня цікавяцца рабочымі гарадамі

Яны лічаць гэта не сваёй справай

У адным з апошніх нумароў газэты «Труд» была надрукавана тэлеграма сакратара ЎсеЦСПС тав. Вайнбэрга аб задачах, якія стаяць перад прафсаюзамі ў справе разгортваньня арганізацыі рабочых агародаў.

Усім саюзам прапануецца арганізаваць рабочыя брыгады для кантролю і дапамогі ў падшуканьні насельня і інвэнтару для рабочых агародаў.

Што зрабілі нашы прафсаюзныя арганізацыі ў справе садзейнічаньня разьвіцьцю прыгараднага рабочага гародніцтва. Адказны работнік сэктару рабочага забесьпячэньня пры ЦСПСБ, да якога зьвярнуўся наш супрацоўнік, адказаў наступнае:

— Работу па арганізацыі рабочага гародніцтва мы лічым справай каапэрацыі. На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму мы пастанавілі рабіць усялякую дапамогу каапэрацыі ў справе разьвіцьця гародніцтва. Пытаньне аб тым, каб саюзы спэцыяльна заняліся рабочым агародніцтвам, у нас ня ставілася і канкрэтных указаньняў саюзам па гэтым пытаньні ЦСПСБ не дадзена.

Па ўсіх саюзах, куды не зварочваўся наш супрацоўнік, пытаньне аб дапамозе і кантролі над арганізацыяй рабочага гародніцтва ня ўзьнімалася і саюзы ў гэтай справе нічога ня робяць.

Нядбайныя адносіны да кантрактацыі жывёлы

Калегія Менскага аддзяленьня Белкаапсаюзу на сваім апошнім пасяджэньні разгледзела пытаньне аб нядбайных адносінах некаторых спажывецкіх таварыстваў да кантрактацыі жывёлы і непадачы імі вестак аб ходзе кантрактацыі.

Калегія пастанавіла абвясьціць суровую вымову старшыням Койданаўскага, Вузьдзенскага, Лашанскага, Смалявіцкага, Бярэзінскага, Барысаўска-Прыгараднага, Бягомльскага і Пухавіцкага спажывецкіх таварыстваў.

50.000 руб. у сьмецьці

Па горадзе Менску ёсьць 200 крам МЦРК. Усе яны выкідваюць кожны дзень на сьметнік шмат паперы, кардону, шпагату, рагож і фанэры.

Ці ня лепш было-б усё гэта зьбіраць і перадаваць утыль гарадзкому камітэту ўзаемадапамогі. Папершае, гэта дало - б работу яшчэ некалькім сотням чалавек беспрацоўных і беднаму насельніцтву, падругое, дзяржава атрымала-б 50.000 руб. у год.

Я выклікаю краму № 17 і галянтарэйны склад прыступіць да ажыцьцяўленьня маёй прапановы.

КУЗЬМІН.

Ударым па прышыбеевых, дыскрэдытуючых калгасны рух

Каму патрэбны гэтыя скрыўленьні, гэтае чынаўніцкае дыскрэдытаваньне калгаснага руху, гэтыя нявартыя пагрозы ў адносінах да сялян. Нікому, акрамя нашых ворагаў! Да чаго яны могуць прывесьці, гэтыя скрыўленьні? Да ўзмацненьня нашых ворагаў і да разьвянчаньня ідэй калгаснага руху.

СТАЛІН

Дражніць селяніна-калгасьніка абагуленьнем жыльлёвых будынкаў, усе малочнае жывёлы, усе дробнае жывёлы, хатняе птушкі, калі арцельная форма калгасаў яшчэ не замацавана,—хіба ня ясна, што такая «палітыка» можа быць пажаданай і выгаднай толькі нашым заўзятым ворагам.

СТАЛІН

Больш 80 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак Мазыршчыны ўжо ўступілі ў калгасы. Асноўная маса сялянства ўжо зразумела перавагу буйной калектыўнай гаспадаркі над дробнай індывідуальнай. На фоне гэтых дасягненьняў у галіне калектывізацыі на Мазыршчыне нельга ня спыніцца на радзе адмоўных момантаў, на дапушчаным у некаторых мясцох адміністраваньні пры арганізацыі калгасаў.

Так, у в. Стадоліцы, Лельчыцкага раёну, знайшліся такія спрытныя калектывізатары, якія пры стварэньні насеннага фонду калгасу зрабілі раскладку сярод усіх сялян, незалежна ад таго, ці ўвайшлі яны ў калгас ці не. Калі сяляне ня прынесьлі вызначанага ім насеньня, «калектывізатары» зрабілі вобыск і забралі ўсё збожжа, не пакінуўшы нават на спажывецкія патрэбы. Расьпісак сялянам аб тым, што ў іх узята, не давалі.

У гэтай-жа самай вёсцы пры зямляўпарадкаваньні ўся зямля была адведзена пад калгас, ня гледзячы на тое, што з 240 двароў у калгас уступіла толькі 47. Тым, хто ня ўступіў у калгас, мясцовыя работнікі заявілі, што іх высяляць у другое месца на горшую зямлю. Яшчэ лепш, абагуленую жывёлу паставілі ў хлявы беднякоў і сераднякоў, што ня ўступілі ў калгас, а жывёлу гэтых апошніх выгналі на вуліцу.

Цікава запытацца, ці атрымалі па заслугах такія гора - калектывізатары? За такія «рэчы» трэба проста аддаваць пад суд.

Мы ўжо ня раз пісалі аб тым, што правільная арганізацыя і аплата працы ў калгасе — адна з галоўных умоў для замацаваньня калгасу. Гэтае пытаньне патрабуе належнай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў. Наскокі ў гэтай справе, няправільныя ўстаноўкі часта прыносяць вялікую шкоду калгаснаму руху. Прыкладам гэтага можа паслужыць в. Лясхавіцы, Пятрыкоўскага раёну тэй-жа Мазыршчыны. На сходзе калгасьнікаў у гэтай вёсцы старшыня Пятрыкоўскага райкалгассаюзу і адзін прадстаўнік з Мазыра вось як растлумачылі калгасьнікам аб арганізацыі і аплаце працы. «Той, хто будзе ў калгасе добра працаваць, той будзе есьці сыр з маслам, а хто дрэнна, той будзе есьці бульбу». Зразумела, такое «растлумачэньне» важнейшай і сур'ёзнейшай справы, як арганізацыя працы ў калгасе, толькі шкода. Некаторыя з калгасьнікаў падалі заявы аб выхадзе з калгасу.

У вёсцы Пальчыкі (Віцебшчына) прыбыў прадстаўнік сельсавету. На жаль, ён ня здолеў, як належыць, растлумачыць сялянам перавагу калектыўнай гаспадаркі, добра расказаць аб жыцьці і рабоце ў калгасе. Сяляне, не зразумеўшы сутнасьці калектывізацыі, адмовіліся ісьці ў калгас. Што-ж ві думаеце тады зрабіў гэты прадстаўнік (прозьвішча яго Шляхтупоў)? Замест таго, каб яшчэ раз растлумачыць сялянам, Шляхтупоў патрабаваў ад іх расьпісак аб тым, што яны... не жадаюць уступіць у калгас! Сяляне пераналохаліся і пачалі запісваць у калгас. Зразумела, якую карысьць можа прынесьці такая паперовая калектывізацыя!

Але пальма пярэдства ў адносінах перагібаў пры правядзеньні калектывізацыі належыць бязумоўна сакратару Лучэцкай парт'ячэйкі (Мазыршчына) Мазу Барысу. Серадняку і беднякоў, якія не хацелі ўступіць у калгас, ён проста арыштоўваў. Арыштаваныя кожны дзень выклікаліся да грозных сакратара для «перакананьня» ў неабходнасьці ўступіць у калгас. Ці арыштаваны сам гэты дзяржыморда?

Былі дапушчаны перагібы і іншага парадку. У Каралінскім раёне ў в. Каменка (Мазыршчына) усім бедняком, якія ня ўступілі ў калгас, спынілі выдачу хлеба. У Засьпенскім і Арцюкоўскім сельсаветах (Гомельшчына) бедняком, якія не ўвайшлі ў калгас, не адпускаюць дроў. Засьпенскі сельсавет пашоў яшчэ далей: хвораму бедняку Ярцаву адмовілі ў выдачы спраўкі для прадстаўленьня ў амбуляторыю на тэй прычыне, што ён ня член калгасу (!). У Ровенска - Слабодзкім сельсавеце селяніну Куцэлеву не адпусьцілі цукру, казалі раней трэба ўступіць у калгас. Спажывецкае т-ва гэтага сельсавету катэгарычна папярэдзіла ўсіх сваіх пайшчыкаў, каб яны ў трохдзённы тэрмін уступілі ў калгасы, бо інакш ім будзе адмоўлена ў выдачы тавару. Гэроем усіх гэтых мерапрыемстваў зьяўляецца старшыня праўленьня Дворкінд. Камэнтары тут ліішня.

У некаторых мясцох пры правядзеньні калектывізацыі справа даходзіла нават да такіх «курэзаў». Так, у вёсцы Дрычэна (Меншчына) быў скліканы сход пад кіраўніцтвам ячэйкі мар'інагорскага тэхнікуму. На гэтым сходзе некаторыя жанчыны выказаліся супроць арганізацыі калгасу ў гэтай вёсцы. На жаль, знайшліся такія «калектывізатары», якія знайшлі «выхад» са становішча: замкнулі дзьверы і заявілі —«або падпішэцеся, або ня пусьцім вас да дому».

У Старынкаўскім сельсавеце, Койданаўскага раёну, калгасьніцы прышлі да старшыні сельсавету Козела і пачалі яму выказваць свае сумненьні наконт калектывізацыі, якую ён праводзіць. Пры гэтым калгасьніцы спасылаліся на артыкулы ў газэтах.

Старшыня Козел, замест таго, каб растлумачыць калгасьніцам гэтыя непаразуменьні, загадаў разыйсьціся і распарадзіўся не выдаваць ім газэт.

Вельмі нетактычна падышлі да абагуленьня маемасьці працаўнікі Губіцнага сельсавету (Гомельшчына). У гэтым сельсавеце арганізаваўся калгас. Але частка сялян у калгас яшчэ ня ўступіла. Мясцовыя працаўнікі пры абагуленьні жывёлы не разьбіралі, ці ўступіў у калгас, ці не, а абагульвалі жывёлу ўсіх гаспадараў. Напрыклад, у серадняка Разунова забралі карову і цёлку. Яго пратэсты ні да чаго не прывялі. Тое-ж самае здарылася і з бедняком Захараўым. Спрытныя «калектывізатары» хутка зразумелі, што яны перагнулі палку. Але замест таго, каб зараз-жа выправіць свае памылкі, яны напісалі заведамa іжыжыва паперку ў райвыканком, што Разуноў і Захараў былі калгасьнікі і саманольна, пасьля абагуленьня, забралі назад жывёлу. Такі-ж факт меў месца і ў Суракаўскім сельсавеце, Аршанскае акругі, дзе абагульвалі жывёлу, насеньне і інвэнтар усіх гаспадароў, нават і ня ўступіўшых у калгас.

Некаторыя гора - калектывізатары, каб апраўдаць дапушчаныя імі скажэньні лініі партыі, пачынаюць спасылацца на ўсякія аб'ектыўныя ўмовы, што гэта, моў, патрэбна было для посьпеху калектывізацыі і г. д. Да ліку такіх належыць і былы старшыня Сеньненскага райвыканкому Гнеўка. Ён прызнаўся:

«Так, праўда, мы перагнулі крыху пры індывідуальным нападатканьні. Закранулі цэлы рад сераднякоў. Некаторых з іх раскулачылі». На запытаньне, што выклікала такія меры, Гнеўка не знайшоў іншага адказу, як — «каб з большым посьпехам правесьці калектывізацыю ў раёне».

Усе вышэйпаданыя факты гавораць аб тым, што ў радзе месц працаўнікі не ураэумелі дырэктывы партыі. Замест растлумачальнай работы сярод сялянства яны ўжывалі адміністрацыйныя мэтады, груба скажалі палітычную лінію партыі. Зразумела, гэта прынесла толькі шкоду калгаснаму будаўніцтву, гэта ліло ваду на млын нашых клясавых ворагаў.

Марудзяць з пераходам на новы статут

(Ад нашага Бабруйскага карэспандэнта)

Рагачоўска - Жлобінскі агракамбінат мае рад буйных дасягненьняў у галіне калектывізацыі, абагуленьня скаціны і інвэнтару. Але трэба падкрэсьліць, што дасягнутыя посьпехі не замацоўваліся. У рабоце па калектывізацыі была пагоня за эфэктам — хто больш процантаў абагуліць. У некаторых мясцох абагульвалі ўсіх кароў, не падрыхтаваўшы загадзя добра абсталяваных хлявоў, не стараючы кармавое базы.

Побач з абагульненьнем не праводзілася адпаведная растлумачальная палітыка-выхаваўчая работа. Наадварот, пры абагульненьні мы мелі рад фактаў недапушчальнага адміністраваньня і скажэньня лініі партыі. Арганізаваўшы калгасы, мала хто падумаў аб правільнай арганізацыі працы, працоўнай дысцыпліне. У выніку такіх нядбайных адносін да калектывізацыі мы маем у апошні час пасобныя выпадкі выхаду з калгасаў.

Новы статут аб сельска-гаспадарчай арцелі не растлумачваецца масам калгасьнікаў. Кулацкай агітацыі за апошнія тыдні не дасцца належнага адпору. Кулакі, якія заклікаюць калгасьнікаў забіраць назад абагуленае насеньне і коняй, ня прыцягваюцца да адказнасьці. Дайшло да таго, што ў некаторых цунктах кулакі забралі з калгасных хлявоў канфіскаваную ў іх скаціну. Сельсаветы ніяк не рэагуюць на гэта.

Трэба моцна ўдарыць па тых, хто скажае лінію партыі пры правядзеньні калектывізацыі, а таксама і тых, што прымірэнча адносяцца да кулакоў і не вядуць належнай барацьбы з кулацкай агітацыяй, не даюць ёй належнага адпору.

А. М.

Віцебскі калгассаюз спасылаецца на „аб'ектыўныя ўмовы"

Да веснавое сяўбы засталося ўжо мала часу. Між тым у калгасах акругі мы назіраем рад фактаў блытаніны і непаразуменьняў у пытаньнях у ліку інвэнтару і маемасьці, арганізацыі працы і сыстэмы яе аплаты.

Ад акруговых арганізацый калгасы яшчэ не атрымалі належных дырэктыў. Там усё яшчэ займаюцца агульнымі разважаньнямі. Толькі тымі днямі Калгассаюз разаслаў на месцы папярэднія матар'ялы аб формах працы калгасаў, усе гэтыя матар'ялы носяць агульны характар.

На запытаньне, чаму не распрацаваны канкрэтныя дырэктывы і паказаньні для калгасаў у галіне арганізацыі вытворчасьці і працы, намесьнік старшыні акркалгассаюзу спасылаецца на «аб'ектыўныя» умовы.

— Бачыце, увесь час займаліся абагуленьнем насеньня і жывёлы. Ня было часу распрацаваць адпаведных дырэктыў.

Такім чынам, напярэдадні сяўбы калгасы Віцебшчыны накуль што застаюцца без належных дырэктыў аб арганізацыі вытворчасьці і працы.

ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ

НОВЫЯ СЫГНАЛЫ З ПОЛАЧЧЫНЫ

У Асьвейскім раёне паравыбары праходзяць бяз усякай папярэдняй работы сярод беднаты

Справаздачна-перавыбарчая кампанія па Асьвейскім раёне, Полацкае акругі, праходзіць нездавальняюча. Весткі з трох пераабраных сельсаветаў паказваюць, што да перавыбараў раён быў зусім не падрыхтаваны. **Ні на сходах беднаты, ні на агульных сходах сялян не абгаворваліся асновы палітыкі партыі на вёсцы ў сувязі з калектывізацыяй і ліквідацыяй кулацтва, як клясы.** Беднота ня была арганізавана. Работа з ёю праводзілася па такіх мэтадах, якія акрамя адмоўных вынікаў нічога не давалі. Сходы беднаты пачыналіся за гадзіну да перавыбараў. Кандыдатуры ў сельсавет абмяркоўваліся пасьпешна і нясур'ёзна, праект паказаў зусім не абгаворваўся.

У Сенькаўскім сельсавеце партыец, які праводзіў сход беднаты, **прагнаў са сходу серадняковy па тых матывах, што сход «можа стушавацца».** Нядзіва, што больш адсталыя сераднякі, напоены кулакамі, прабавалі зрываць сходы, пагражаць калгасьнікам. Кандыдатуры ў саветы, рэкамэндаваныя парт'ячэйкамі, правальваліся. Па трох сельсаветах абраны толькі адзін член КП(б)Б.

Партыйцы і камсамольцы ня ведалі, каго трэба правесьці ў сельсавет. Былі выпадкі, калі на сходах яны выступалі адзін супроць другога. Такая блытаніна мела месца таму, што ячэйкі раней не абмяркоўвалі кандыдатур. Сакратар Сухарукаўскай камсамольскай ячэйкі на пленуме сельсавету галасаваў супроць рэкамэндаваных ячэйкай кандыдатур.

Брыгада, якая прыяжджала ў дапамогу мясцовым арганізацыям, ня была праінструктавана і сваім падыходам да сялянства яшчэ больш ускладніла ход падрыхтоўчай работы. Брыгадзір, які праводзіў сход сялян у Асьвейскім сельсавеце, пагрозамі хацеў правесьці калектывізацыю.

У сваёй прамове ён заявіў, што «з тымі, хто супроць калектывізацыі, мы потым разьлічымся» і загадаў аўдыторыі разьдзяліцца: «Хто за калектывізацыю—сядай у адзін бок, хто супроць—у другі».

У момант заміткі з прыёмам наказу, ён сказаў: «Вы контр-рэвалюцыянэры, калі вы супроць наказу, як мерапрыемства партыі і ўлады».

При такіх мэтадах падрыхтоўкі ад перавыбараў у Асьвейскім раёне чакаць добрых вынікаў ня прыходзіцца.

Брыгадзір «Зьвязды» ХАЛЯВІН.

УЗОРЫ СЛАБОЕ ПАДРЫХТОЎКІ

Папярэднія весткі аб ходзе перавыбараў саветаў па Менскай акрузе сьведчаць аб тым, што належная падрыхтоўчая работа да перавыбараў на мясцох праведзена зусім нездавальняюча. Слаба мабілізавана ўвага батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас выбаршчыкаў.

Удзел выбаршчыкаў у перавыбарах сельсаветаў сёлета невыстарчальны. Атрыманыя ад 7 раёнаў весткі аб выбарах па 22 сельсаветах наступныя: на Сьмілавіцкім раёне (раён суцэльнай калектывізацыі) процант удзелу выбаршчыкаў параўнальна з мінулым годам паменшыўся на 13.94, па Лагойскім—на 13,36, па Чэрвенскім—на 9,8 і па Халопеніцкім—па 1,00. Па іншых раёнах вельмі нязначнае павялічэньне, напрыклад, па Самахвалавіцкім—на 1,68, па Койданаўскім—на 2,2 і па Бягомльскім—на 5,58 проц.

Процант абраных у склады новых сельсаветаў рабочых, сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў невыстарчальны, а па некаторых раёнах параўнальна з мінулым годам нават паменшыўся. Таксама значна паменшыўся процант абраных жанчын.

П. Я.

***

Усяго па Менскай акрузе на 9 сакавіка перавыбраны 24 сельсаветы. З агульнага ліку выбаршчыкаў 36.954, на перавыбары зьявілася 22.797 чалавек. З ліку 16.599 выбаршчыкаў-жанчын на перавыбары зьявілася 9.705. Усяго ў сельсаветы выбрана 722 чалавекі; з іх 169 жанчын, камуністых—58, камсамольцаў—63.

Сацыяльны склад абраных: 47 чал. с.-г. рабочых і батракоў, 308 вызваленых ад падатку, 335, якія плацяць падатак бяз процантнай надбаўкі, 5 плацяць падаткі з процантнай надбаўкай і інш. 43 чал.

ПЕРАВЫБРАНЫ 143 СЕЛЬСАВЕТЫ

Паводле вестак інфармацыйнага аддзелу ЦВК, на 9 сакавіка па БССР пераабраны 143 сельсаветы, або 11,1 проц. усіх сельсаветаў Беларусі.

На справаздачна-перавыбарныя сходы зьявіліся 63,2 проц. усіх выбаршчыкаў, жанчын—52,7 проц. У члены новых сельсаветаў абрана 5.080 чал., з іх 22 проц. жанчын, камуністых—8,6 проц., камсамольцаў—7,3 проц., с.-г. рабочых і батракоў—6,8 проц., сялян вызваленых ад падатку—48,2 проц., сялян, якія плацяць падатак бяз процантнай надбаўкі—39,8 проц., сялян, якія плацяць падатак з процантнай надбаўкай—0,6 проц. і іншых—4,6 проц. Калгасьнікаў абрана 75,6 проц. Сельсаветаў абрана: па Аршанскай акрузе—24, Віцебскай—12, Гомельскай—14, Менскай—22, Мазырскай--2, Магілёўскай--64 і Полацкай—5. Ад Бабруйскай акругі вестак няма.

З гэтых вестак відаць, што процант абраных партыйцаў і камсамольцаў параўнальна з весткамі на 7-га сакавіка паменшыўся на 1,9 проц., а параўнальна з мінулым годам—на 0,8 проц. Паменшыўся і процант яўкі на 1,2 проц. у параўнаньні з данымі на 7 сакавіка.

Праўленьне калгасу абмяркоўвае план веснавой сяўбы.

Пленум Менскага гарсавету

МІЛЬЁН РУБЛЁЎ НА ЖЫЛЬЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА

Пазаўчора адбыўся пленум Менскага гарсавету, на якім старшыня праўленьня Белжылсаюзу т. Левін зрабіў даклад аб рабоце жыльлёвай каапэрацыі.

Усяго за мінулы будаўнічы сэзон у Менску было забудавана пад кватэры 23.755 кв. мэтраў. Будаўніцтва шмат перашкаджала адсутнасьць даволі кваліфікаванага тэхнічнага пэрсаналу. Якасьць рамонтаў не заўсёды была здавальняючая. Для будаўніцтва ў надыходзячым сэзоне асигнавана звыш 1 млн. руб. крэдытаў, у мінулым-жа годзе было выдана толькі 311 тыс.

Сёлета вялікае будаўніцтва распачнецца ў ЖАКТ'е «Чырвоны Чыгуначнік», дзе будзе пабудаваны дом-камуна на 700 чал. У гэтым будынку будзе зьмяшчацца сталовая, кухня і розныя дзіцячыя ўстановы (ясьлі, дзіцячыя сады, пляцоўкі і інш.). Уся хатняя гаспадарка жыхароў гэтае камуны абагульваецца. Такія-ж дамы-камуны сёлета мяркуе пабудаваць Скуртрэст і Харчтрэст.

Інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам БЖС сёлета забесьпечана на 70-80 %, а рабочую сілаю—на 60 проц. Такі недахоп рабочае сілы тлумачыцца тым, што будаўнічыя арганізацыі свячасова не зрабілі заявак. Зараз усе гэтыя ненармальнасьці зьнішчаюцца.

На рамонтныя работы асигнуецца 1.200.000 руб., на 22 проц. больш супроць мінулага году. БЖС вызначыў спэцыяльных тэхнікаў для будаўнічых работ у ЖАКТ'ах.

БЖС, пры дапамозе рабочых брыгад і жактаўскага актыву, правёў вялікую работу па высяленьні непрацоўнага элемэнту з жактаўскіх будынкаў. Усяго выселена 71 сем'я. У будынкі, якія аслабаніліся пасьля высяленьня непрацоўнага элемэнту, зьмешчана 65 сем'яў рабочых і 26 служачых. Зараз БЖС надае ў СНК праект аб высяленьні лішэнцаў з усіх жактаўскіх будынкаў у адміністрацыйным парадку. ЖАКТ'ы шырока разгарнулі культурна-асьветную працу сярод сваіх жыхароў.

Выступаўшыя ў спрэчках члены гарсавету адзначылі цэлы рад недахопаў у працы жыльлёвай каапэрацыі. Так, жыльлёвае будаўніцтва адстае ад прамысловага будаўніцтва. БЖС слаба кіруе дзейнасьцю ЖАКТ'аў і не правярае іх работы. Мала ўцягнута рабочых у жыльлёвую каапэрацыю.

Большая частка з прамоўцаў спынялася на зачараваным коле, якое стварылася ўвыніку няправільнай палітыкі жактаў. Каб атрымаць кватэру, трэба быць пайшчыкам зрыльлёвай каапэрацыі. А каб стаць пайшчыкам, трэба мець кватэру.

Некаторыя паказвалі на нядбайныя адносіны жактаў да рамонту дамоў. Рамонт пачынаюць тады, калі дамы ўжо знаходзяцца напярэдадні развалу.

Чакаем адказу Менкамгасу

Ня гледзячы на тое, што ў газэце «Зьвязда» ня раз ужо пісалася аб нядбайных адносінах Менкамгас

УСЕБЕЛАРУСКАЯ С.-Г. ВЫСТАВУКА

ўсё яшчэ не забясьпечана матар'яламі і рабочай сілай

Выстаўку фактычна пачалі будаваць з ліпеня месяца 1929 году. Да гэтага часу яшчэ справа з будаўніцтвам будынкаў і павільёнаў выстаўкі знаходзіцца ў крытычным становішчы. Калі зараз ня будуць прыняты самыя рашучыя меры да забесьпячэньня будаўніцтва неабходнымі матар'ялямі поўнасьцю, то няма ніякай упэўненасьці ў тым, што выстаўка будзе сваячасова адчынена.

Такое становішча тлумачыцца тым, што да выстаўкі ня было належных адносін ня толькі з боку Дзяржбуду (які яе будуе), але і інш. установаў. Галоўвыстаўком і дырэкцыя не праявілі належнай увагі і настойлівасьці ў сваячасовым забесьпячэньні будаўніцтва матар'ялямі, якія трэба было загатовіць яшчэ 2 месяцы назад.

Зараз дырэкцыя выстаўкі сьпяшаецца з будаўніцтвам для таго, каб яго скончыць да 1 мая. Складзены наступны календарны плян будаўнічых работ. Галоўны павільён арганізацыі сацыялістычнае гаспадаркі павінен быць скончаны 17-га мая, павільён мэханізацыі і электрыфікацыі — 25 мая, павільён земляробства — 15 красавіка, мэліярацыі — 10 мая, лясное гаспадаркі — 10 мая, рыбаводзтва — 15 чэрвеня, няжывых экспанатаў — 5 мая, птушніцтва — 10 мая, буйное рагатае жывёлы — 5 мая, коняй — 5 мая, сьвіней — 8 мая, авечак — 5 мая, вэгэтацыйны — 10 мая, садоўніцтва і гароднiцтва — 5 мая, масавых экспанатаў — 15 мая, ільна - канаплянага камбінату — 10 чэрвеня. Павільён рэспубліканскае прамысловасьці — 1-га чэрвеня, павільён Лесбелу — 15 мая, павільён Дзяржбуду—15 чэрвеня, павільён мясцовай і саматужнай прамысловасьці — 15 мая, экспарту, імпарту і гандлю — 15 мая, павільён быту і працы — 25 мая, камунальнае гаспадаркі і транспарту — 1-га чэрвеня, снажывецкай каапэрацыі — 1 чэрвеня.

Каб ажыцьцявіць гэты каляндарны плян, патрэбна зараз 120 вагонаў лесаматар'ялу, валаправодныя трубы, жалеза і інш. будаўнічыя матар'ялы з тым, каб яны былі дастаўлены на выстаўку не пазьней 20 сакавіка — да веснавога разводзьдзя.

Каб узмацніць тэмп будаўніцтва, неабходна давесьці колькасьць цесьляроў і сталяроў да 400, замест працуючых зараз 90, і забясьпечыць будаўніцтва кваліфікаванай тэхнічнай і рабочай сілай.

5 сакавіка Наркамгандлем дан нарад Лесбелу адпусьціць для выстаўкі 30 вагонаў лесаматар'ялу, але з дастаўкаю яго на выстаўку справа пакуль што ня рушыцца.

ВОНГБ зрабіў распаражэньне, каб завод «Дрэваапрацоўшчык» на працягу 4 дзён выраблянуў драўніну (дошкі і інш. матар'ял) выключна для выстаўкі. Аднак, з 720 куба-мэтраў папала на выстаўку ўсяго толькі 240 к. м. (3.200 дошчак). Такім чынам, каля 500 куб. мэтраў гэтае драўніны за лік выстаўкі ўсё-ж было накіравана на іншае будаўніцтва.

Дзяржбуду трэба рашуча спыніць такія агідныя адносіны да выстаўкі і прыняць рашучыя захады, каб усё гэта будаўніцтва сваячасова закончыць.

АЎДАРАЎ.

Грамадзкае харчаваньне

Новыя рабочыя сталовыя ў Менску

МЦРК пачаў пабудову на Ракаўскай вул. кухні-разьмеркавальніцы, з якое абеды будуць выдавацца пайшчыкам на дом і ў тэрмасах развозіцца па сталоўках заводу.

На летні час МЦРК з мэтаю арганізацыі грамадзкага харчаваньня на адкрытым паветры, мяркуе адчыніць у Менску 6 садоў-сталовых.

Пачата пабудова сталовак на 5.000 чал. на тэрыторыі с.-г. і прамысловай выстаўкі для абслугоўваньня экскурсантаў выстаўкі.

Акрамя таго на выстаўцы будзе абсталявана чайная, закусачная паводле тыпу амэрыканскіх (будуць есьці стоячы).

Пры доме ўраду распачата пабудова сталовае для сэзонпікаў на 600 чалавек.

Пры Меншвэі ў гэтым годзе будзе пабудавана вялікая сталовая, якая будзе абслугоўваць рабочых Меншвэю. Сталоўка разьлічана на 3.000 чалавек.

На Савецкай вул. будзе пабудавана сталоўка-амэрыканка, разьлічаная на 500 чал.

ЗНІЖЭНЬНЕ ЦЭН У МЕНСКІХ СТАЛОВЫХ

МЦРК з 1-га сакавіка зьнізіў цэны на прадукты харчаваньня ў сталовых № 1, 3, 8 і 9. Кошт абеду зьніжаны на 2,42 проц., парцыённыя—на 1,8 проц., чай—на 16,7 проц. і закускі з буфэту — на 3,28 проц.

У сталоўцы № 2 з 6-га сакавіка кошт абеду зьніжаны на 1,58 проц., парцыённыя—на 3 проц., чай—на 12,5 проц. і за кускі з буфэту—на 4,13 проц.

У сталоўцы № 11 кошт чаю зьніжаны на 16,7 проц. і закускі з буфэту—на 4,13 проц.

Рэарганізацыя сыстэмы спажывецкай каапэрацыі на Меншчыне

Спажывецкая каапэрацыя Меншчыны ўжо практычна прыступіла да рэарганізацыі сваёй нізавой сеткі ў раёнах суцэльнае калектывізацыі, прыстасаваньня яе да лепшага абслугоўваньня запатрабаваньняў сацыялістычнага сэктару вёскі.

У першую чаргу рэарганізуецца сетка па СЬМІЛАЎСКІМ РАЁНЕ, дзе, замест існаваўшых 5-ці спажывецкіх таварыстваў, пастановаю раённага зьезду ўпаўнаважаных утворана адно раённае шматкрамнае спажывецкае т-ва «Камуна».

Павялічваецца крамная сетка (па раёне была 31 крама, да канца году будзе 46), наладжваецца сетка хлебапякарань і сталовак, будзе забясьпечан шырокі ўдзел калгаснае грамадзкасьці ва ўсёй рабоце спаж. т-ва; пашыраецца склад праўленьня і рэвіз. камісіі (на 15 асоб); пры куставых аб'яднаньнях арганізуюцца каапбюро, а таксама кантрольна-крамныя камісіі пры крамах і прадпрыемствах.

В. Д—о.

ЗЬВЯЗДА.

МЕНСК

Пазаўчора ў Менск прыехала брыгада ЦК УсеЛКСМ для правядзеньня перавыбораў дзіцячага актыву і праверкі выкананьня паказаў зьлёту.

На здымку. Сядзяць зьлева направа: **Казлоўская, Альхоўскі** (рэдактар «Затейника»), **Галеўская**. Стаяць зьлева направа: **Ульмастраў і Фэўралёва.**

АБ ПРАЦЫ У ДЗЕНЬ 12-га САКАВІКА

Наркампрацы БССР паведамляе, што 12-га сакавіка—дзень лютаўскае рэвалюцыі, прадпрыемствы і установы, якія перайшлі на бесьперапынны рабочы тыдзень, а таксама прадпрыемствы, якія перайшлі на пяцідзёнку, паводле пастановы СНК СССР працуюць нармальна.

Ва ўсіх іншых прадпрыемствах пытаньне аб працы ў дзень 12-га сакавіка павінна вырашацца на агульных сходах рабочых данага прадпрыемства.

Курсы падрыхтоўкі батракоў у с.-г. акадэмію

У Менску, Рагачэве, Амсьціслаўлі і Віцебску пачаліся заняткі на курсах па падрыхтоўцы с.-г. рабочых і батракоў у Беларускую с.-г. акадэмію. На курсах пакуль навучаецца 200 чалавек. Курсанты забясьпечаны стыпэндыямі ў разьмеры 50 руб. і інтэрнатамі. У бліжэйшым часе саюз с.-г. рабочых адкрывае курсы па падрыхтоўцы батракоў у Полацкі лясны тэхнікум на 60 чал. і ў Віцебскі рабфак—на 100 чал.

ЯК ВЫКАНАНЫ ЭКСПАРТНЫ ПЛЯН ЗА СТУДЗЕНЬ

Эканомпарада БССР прызнала, што большасьць арганізацый ня выканалі экспартнага пляну за студзень. Лесбел выканаў заданьне толькі на 52 проц., Белсампрамсаюз—на 61 проц., Белдзяржгандаль на 86,3 проц.

Эканомпарада зьвярнула ўвагу Белкаапсаюзу, Белшчапіны, Белпаляводсаюзу, Шклатрэсту і папяровага трэсту на нездавальняючы тэмп выкананьня экспартных заданьняў. Абвешчана вымова праўленьню Лесбелу, старшыні Белсампрамсаюзу т. **Брыскіну** і старшыні Белдзяржгандлю т. **Шэйніну.**

РАСПУШЧАНЫ ПРАФКОМ БЕЛАРУСКАЙ С.-Г. АКАДЭМІІ

За поўную пасіўнасьць у правядзеньні рэформы вышэйшай школы, слабы ўдзел у калектывізацыі і падрыхтоўцы да веснавое пасеўнае кампаніі і дрэнную пастаноўку палітыка - выхаваўчай работы сярод студэнцтва распушчаны прафком Беларускай с.-г. акадэміі. Старшынёю прафкому абраны студэнт акадэміі—батрак саўгасаў імя Леніна, Аршанскай акругі, тав. **Марчанка.**

У прэзыдыуме ЦВК БССР

Абавязковае страхаваньне пажарнікаў

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў праект пастановы аб абавязковым дзяржаўным страхаваньні працаўнікоў пажарных каманд БССР. Згодна пастановы, дзяржаўныя ўстановы і гаспадарчыя органы абавязаны страхаваць пажарнікаў ад выпадкаў, якія выклікаюць сьмерць або страту працаздольнасьці пры выкананьні службовых абавязкаў.

Укамплектаваньне вайсковых школ

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў склад Цэнтральнай камісіі па ўкамплектаваньні вайсковых школ. Старшыня камісіі т. **Васілеяіч** (начальнік АБВШ), намесьнік старшыні — т. **Дубаўцоў**, члены т.т. Конюхаў, Гольмшток, Вайсковіч, прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, Асавіяхіму і МенАВК. Акруговым і раённым выканаўчым камітэтам даручана арганізаваць акруговыя і раённыя вярбовачныя камісіі.

Новы статут музэю рэвалюцыі

Прэзыдум ЦВК зацьвердзіў палажэньне аб музэі рэвалюцыі. Музэй рэвалюцыі будзе знаходзіцца пры ЦВК БССР і зьяўляецца навукова-дасьледчай установай агітацыйна-асьветнага характару. Задача музэю — падбор, вывучэньне і хаваньне матар'ялаў, якія характарызуюць клясавую барацьбу на Беларусі. Музэем кіруе навуковы савет.

За дзень

⊙ ЦП саюзу хэмікаў арганізуе паўтарамесячныя курсы для нізавога партактыву. З Менску і Магілева на курсы будзе паслана па 6 чалавек, з Віцебску—4 чалавекі і з Гомеля—5 чал.

⊙ ЦП саюзу хэмікаў асыгнавала **350.000 руб.** на пабудову клюбу ў Рэчыцы.

Пабудова клюбу будзе скончана ў 1931 годзе. Клюб разьлічаны на абслугоўваньне рабочых фабрыкі «Днепр» і фабрыкі імя 10-цігодзьдзя Кастрычніка.

⊙ ЦП саюзу друкароў выказалася за перадачу менскага працакалектыву друкароў і гомельскай каробачнай фабрыкі імя Клары Цэткін аддзелу мясцовай прамысловасьці.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 20 гадз.—вечар Дзяржаўнага яўрэйскага тэатру для членаў КП(б)Б і ЛКСМБ пры ўдзеле ўсяе трупы і аркэстру. Білеты ў чытальні Дому і па прадпрыемствах.

Дом Асьветы. У 19 гадз—даклад нам. заг. культпропу ЦК КП(б)Б т. Будзінскага аб правым ухіле ў культурным будаўніцтве (тэатры. кіно, літаратура). Уваход па разасланых білетах МК.

Пасяджэньне т-ва вайўнічых матэрыялістых-дыялектыкаў Беларусі з наступным парадкам дня.

1. Даклад праф. **Бурстына**—закономернасьць з пункту погляду сучаснае фізыкі і 2. Арганізацыйныя пытаньні Пач. у 20 гадз. у Камвузе (Ленінскі габ.).

Да ведама членаў сэкцыі нав. працаўнікоў. Падача анкет навуковымі працаўнікамі для атрыманьня курортнае дапамогі адбываецца да 15 сакавіка. Пасьля гэтага тэрміну прыём анкет будзе спынены.

— **Клюб «Медпрацаўнік».** У 21 гадзе адбуда. 2-е пасяджэньне менскай навуковай асацыяцыі пры саюзе Мэдсанпрацы. Парадак дня: 1. Дэманстрацыя хворых, 2. Аб захворваньні на эфімізэму і сухоты ў шкладуваў (дакл. д-р Фэйгін), і 3. Раптоўная сьмерць пры эндопаразытах мозгу (дакл. Чарвакоў В. Ф.). Запраш. рабочыя гуты «Пралетары».

— З 10-III па 1-IV-30 г. біб-ка Дому Асьветы праводзіць перарэгістрацыю чытачоў біб-кі.

Перарэгістрацыя будзе адбывацца ад 6 да 11 гадз. увечары. Асобы, якія не перарэгістраваліся да паказанага тэрміну, будуць лічыцца мэханічна выбылымі з біб-кі. Для перарэгістрацыі неабходна мець сяброўскі клюбны білет.

Бібліятэка Дому Працасьветы апошні раз паведамляе таварышоў, якія трымаюць у сябе кніжкі больш двух тыдняў, зьвярнуць іх у пяцідзённы тэрмін.

Не зьвярнуўшыя ў паказаны тэрмін будуць прыцягнуты да адказнасьці.

ЗАЎТРА

Дом Камасьветы. Даклад тав. ЮГАВА для парт. і кам. актыву на тэму «Зьвяржэньне самаўпадзтва»—у 18 гадз. Пасьля дакладу—мастацкая частка. Білеты ў РК КП(б)Б і ЛКСМБ.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Вывады камісіі па праверцы членаў і кандыдатаў партячэйкі шчотачнай фабрыкі імя Крупскай у ленкутку ф-кі (вул. Роза Люксэмбург, 26). Пач. у 17 гадз. Яўка членаў і кандыдатаў партыі абавязкова. Запрашаюцца рабочыя шчотачнай фабрыкі і іншых прадпрыемстваў.

Клюб Працасьветы. 14-га сакавіка ў 19 гадз. склікаецца першая група Фрунзаўскага раённага дэлегацкага сходу, у гэты-ж самы час у клюбе саўгандальслужачых склікаецца трэцяя група. Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Забараніць лячэньне сыфілітыкаў у агульных зубных габінэтах

Паставіўшы парад сабой задачу паголоўна ахапіць усіх хворых на вэнэрычныя хваробы дыспансэрызацыяй, органы аховы здароўя не зьвярнулі належнае ўвагі на адно вельмі пенармальнае зьявішча, гэта—на сумеснае лячэньне ў нашых агульных амбуляторыях, побач з усялякага роду хворымі. і сыфілітыкаў. Такія факты асабліва маюць месца ў нашых зубалекавых амбуляторыях, куды паступаюць хворыя на сыфіліс лячыць поласьць роту і зубоў. Нам добра вядома, што поласьць роту зьяўляецца самым улюбёным месцам для асяданьня сыфілітычнай інфэкцыі, а выявіць гэту хваробу, паставіць дыягноз яе бяз шырокае клінічнае практыкі часта вельмі цяжка. Між тым, нашы зубныя дактары, трэба адкрыта сказаць, у гэтых адносінах такое практыкі якраз і ня маюць.

Зубны доктар мог-бы яшчэ ўжыць моры перасьцярогі пры лячэньні хворых на сыфіліс, каб не заразіцца самому, а таксама і іншым хворым. Але гэта можна зрабіць толькі тады, калі хворыя на сыфіліс, папярэджаныя доктарам, ня ўтоюць сваёй хваробы ад яго. На жаль, гэта не заўсёды бывае так. Многія сыфілітыкі не знаходзяць у сябе адвагі і сьмеласьці расказаць аб сваёй хваробе зубному доктару.

Вось чаму ў такіх разох доктар. лечачы зубы сыфілітыка, можа сваімі інструментамі перадаць сыфіліс ад аднаго да другога, або і сам заразіцца. Пры гэтым ня трэба забываць, што маленькія раны, драпіны на руках, якіх не заўважвае часта зубны доктар, пры розных маніпуляцыях у роце могуць выклікаць інфэкцыю сыфілісу. Потым трэба таксама мець на ўвазе і тое, што яшчэ ня ўвесь інструментарый і матар'ял зубных паддаецца дасканала стэрылізацыі. Есьць інструманты больш складанай структуры, якія ня могуць, як сьлед, вываярыцца ў гарачай вадзе, а іх трэба абясшкодзіць, абеззаражваць больш удасканаленым спосабам.

Вось чаму, прыняўшы ўсе гэтыя акалічнасьці пад увагу, органам аховы здароўя трэба забараніць лячэньне хворых на сыфіліс у агульных зубных амбуляторыях, а вызначыць для іх спэцыяльныя габінэты.

Такія габінэты лепш за ўсё абсталяваць пры вэнэралёгічных установах Беларусі. Важнай і неадкладнай задачай зьяўляецца арганізацыя зубнога габінэту для лячэньня сыфілітыкаў пры менскім вэнэрычным дыспансэры.

Д-р Я. ДВОРЖАЦ.

Слухайце, слухайце, слухайце!

Пачынаючы з сакавіка па красавік г. г. у Рабоча-Сялянскім Унівэрсытэце па радыё будзе чытацца курс лекцый па **гісторыі рэвалюцыйнага руху на Беларусі.**

Лекцыйныя дні ў сакавіку наступныя: 12, 16 і 23.

Сёньня, 11-га сакавіка, у памяшк. АК МОПР'у
АДБУДЗЕЦЦА
II-гі ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА АКРУГНОМУ МОПР'у.
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Справаздача прэзыдыуму Мен. АК МОПР'у. 2. Даклад аб новых формах і мэтадах працы. 3. Справаздача Барысаўскага РК МОПР'у.
Яўка ўсіх членаў і канд. АК і рэв. кам. АК абавязкова.
Запрашаюцца члены гарадзкіх РК і ячэйковы актыву.
Пачатак роўна а 6 гадз. увечары.
Менакругном МОПР'у

КЛЮБ ДРУКАРОЎ. **СЁНЬНЯ, 11-га сакавіка АДБУДЗЕЦЦА**
АГУЛЬНЫ СХОД ПРАФАКТЫВУ САЮЗУ ДРУКАРОЎ
ПАРАДАК ДНЯ: 1) Даклад аб выніках усебеларускай арганізацыі і добраахвотніцтва. Даклядчык—член прэзыдыуму ЦСПСБ т. Клімковіч. 2) Мастацкая частка.
Яўка членаў ЦП, сэкцыі друку, ФЗК, аборшчыкаў чл. узносаў, членаў усіх камісій ФЗК абавязкова.
Запрашаюцца ўсе рабочыя.
Пачатак а 7 гадз. 30 мін. **Ц. П. САЮЗУ ДРУКАРОЎ.**

СЁНЬНЯ, 11 САКАВІКА, а 7 гадзіне ўвечары
адбудзецца
нарада МОПР-актыву КАСТРЫЧН. РАЙКОМУ МОПР
у памяшк. РК МОПР.
У сувязі з вельмі важнымі пытаньнямі на нараду навіны у абавязковым парадку вызвіцца ў поўным складзе бюро і рэвізкамісіі ячэек.
Кастрычн. РК. МОПР.

13-га сакавіка а 8 гадз. увеч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых, склікаецца
НАРАДА ПРАФАКТЫВУ саюзу саўгандальслужачых г. Менску.
У парадку дня—даклад ЦСПСБ аб выніках арганарады аб рэарганізацыі саюзнага апарату.
Яўка на гэту нараду старшынь МК і ўсяго прафактыву абавязкова.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
11 і 12 сакавіка адчынены спэктакль
„ЦЫРУЛЬНІК з СЭВІЛЬЛІ"
опэра ў 4 дз., муз. РАСІНІ.
Білеты ў рабкасе а 12 да 2 і ад 4—6 у касе тэатру.
Пачатак ад 8 з палов. гадз. увечары.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
Апошнія 4 спэктаклі Э. ТОЛЬЛЕР.
Чацьвер 13 сакавіка для школы імя Чарвякова.
Білеты ў школе (Савецкая вул.) і ў касе тэатру.
ГОЛ-ЛЯ, ЖЫВЁМ
Пачатак а 8 гадз. 30 м.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
З прычыны гэлінага посьпеху 2-гі ТЫДЗЕНЬ
У агні народжаная
Пачатак а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал
Замежны мастацкі фільм
ЧАЛАВЕК АГНЮ
Пачатак 1 сэансу а 7 гадзіне. Каса—ад 5 гадзін.

КІНО Пралетары
Мастацкі фільм вытворч. «Арменкіно»
НЯВОЛЬНІЦА драма ў 6 част.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
МАСТАЦКІ ХРАНІКАЛЬНЫ ФІЛЬМ
УПАД ДЫНАСТЫІ РАМАНАВЫХ
у 7 частках
ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м. Каса адчынена а 12 гадз.

КІНО СпартаК
З панядзелка, 10 сакавіка БАЯВІКІ
КНЯЖНА МЭРЫ
паводле раману Лермантава.
Драма ў 8 частках.
Пачатак 1 сэансу 7 гадз. Каса—ад 5 гадз. 30 м.

Пастановай Савету Працы і Абароны на „САЮЗХЛЕБ" УСКЛАДЗЕНЫ ВУЧОТ І РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ТАРЫ
Прапануецца ўсім дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям у працягу сакавіка месяца ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ усю колькасьць, якая маецца ў наяўнасьці мяхоў, кулей і брэзэнтаў.
Рэгістрацыі падлягаюць мяхі як занятыя прадуктамі, так і вольныя. Рэгістрацыя вытвараецца ўсімі акруговымі аддзеленьнямі Саюзхлеба. Да гэтага-ж тэрміну падлягаюць прадстаўленьню заяўкі на неабходную колькасьць тары да 1 кастрычніка па месяцам.
„САЮЗХЛЕБ".

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА ТАВАРЫСТВУ УЗЕЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-вэнэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва і Народны Камісарыят Асьветы БССР
АБВЯШЧАЮЦЬ шырокі ўсебеларускі КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ дзіцячую кніжку І ЛЕПШУЮ дзіцячую п'есу

ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ:

1. Даць пакаленьню Кастрычніка — нашым акцябратам, піянэрам і школьнікам — радасную, бадзёрую, таленавітую, высока - мастацкую кніжку, якая-б найбольш поўна, яскрава і праўдзіва ў даступнай дзіцячаму разуменьню форме адбівала ідэі камунізму, паказвала сёньняшні дзень — час непасрэднага будаўніцтва сацыялізму.
2. Прыцягнуць старых, выявіць новыя кадры (з пэдагогаў, настаўнікаў, пралетарскіх студэнтаў, пачынаючых паэтаў, журналістых, рабкораў і селькораў, работнікаў дашкольн. выхаваньня) пісьменьнікаў для стварэньня белар. пралетарскай дзіцячай кніжкі.

ТЭМЫ. Прапануем усім жадаючым прыняць у конкурсе ўдзел аўтарам наступныя тэмы для распрацоўкі іх у мастацкай і бэлетрыстычнай форме.

1. **Будаўніцтва сацыялізму** ў Саюзе Саветаў і будучая сусьветная камуна.
2. **Саветы**, як форма пралетарскай дыктатуры і як самая вышэйшая форма дзяржаўнага ладу з усіх існаваўшых і існуючых.
3. **Пяцігодка** і яе сацыяльнае значэньне. Выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.
4. **Беларусь фабрык і заводаў** (індустрыялізацыя БССР).
5. **Будуецца камуністычная вёска** (суцэльная калектывізацыя).
6. **Новы камуністычны быт** (культурная рэвалюцыя).
7. **Рысы новага чалавека** (калектывізм, як у піянэр-атрадзе, у працоўнай політэхнічнай школе, у гурткох і майстэрнях вырастае новы чалавек).
8. **Камуністычная дзіцячая арганізацыя** (дзеці да паступленьня ў піянэрскі атрад, піянэры ды іх актыўная грамадзка-карысная работа ў атрадзе, розьніца паміж неарганізаванымі дзецьмі і піянэрамі).
9. **Чырвоная армія — пільны вартаўнік Савецкага Саюзу** і ўдзельнік сацыялістычнага будаўніцтва.
10. **Сусьветная рэвалюцыйная барацьба**, яе асобныя яркія моманты ранейшых і апошніх часоў.
11. **Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!** (Баявая міжнародная салідарнасьць).
12. **Клясавая барацьба**, як вынік разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва (перамога сацыялістычных элемэнтаў над капіталістычнымі).
13. **Рэвалюцыйнае мінулае** Савецкай Беларусі.
14. **Панскі ўціск** працоўнага народу ў Заходняй Беларусі.
15. **Партызанскі рух** і белапольская акупацыя Беларусі (гэроі партызаны).
16. **Дзеці інтэрнацыяналістыя** (ачышчэньне дзіцячай псыхікі ад атруты нацыянальнай варожасьці, шавінізмаў і г. д.).
17. **Ударныя бязбожнікі** (нясумяшчальнасьць рэлігіі з сьветапоглядам новага чалавека).
18. **Ініцыятыва камуністычнай дзятвы** (юныя канструктары, юныя вынаходцы, юныя тэхнікі і г. д.).
19. **Сацыялістычная прамысловасьць**—асобныя буйныя фабрыкі і заводы, пабудаваныя пры Савецкай уладзе.
20. **Прыродныя багацьці БССР** (лес, торф і інш.).
21. **Прыродныя багацьці СССР.**
22. **Рэалістычная фантастыка** сацыялістычн. будаўніцтва (якім будзе выглядаць Савецкі Саюз праз 5—10 год, як мы «заўтрашнія» ня будзем пазнаваць сябе «сёньняшніх»).

Можна пісаць і на іншыя тэмы, якія маюць сацыяльнае значэньне.

УМОВЫ КОНКУРСУ:

1. Кожная кніжка нямінуча фармуе пэўным чынам сацыяльную псыхіку дзяцей, а таму кожны твор пасланы на конкурс павінен мець ярка-выражаную сацыяльную накіраванасьць, акрэсьленую сацыяльную мэту
2. Дзіцячая кніжка павінна быць высока - мастацкі напісана. Яна павінна даваць дзецям эмоцыі бадзёрасьці, эмоцыі радаснага ўспрыйманьня сацыяльных працэсаў працы, адчуваньне жывой непарыўнай сувязі з калектывам.
3. Мова дзіцячай кніжкі павінна быць мастацкі простай, вобразна - чыстай, зразумелай, новай, якое навучае дзяцей лёгка і правільна выказваць свае думкі.
4. Фантастыка ў дзіцячай кніжцы павінна мець пераважна рэалістычны ды іграві характар і павінна быць цесна ўвязана з сацыяльнаю мэтаю мастацкага твору.
5. Разьмер дасланай на конкурс дзіцячай кніжкі не павінен перавышаць: мастацкая проза — 6 друк. аркушоў, п'есы — 1 друк. аркуш.
6. Рукапісы могуць быць напісаны на беларускай, яўрэйскай, польскай, расійскай ды іншых мовах. **Апошні тэрмін прысылкі рукапісаў — 1-га жніўня 1930 году.**
7. Конкурс будзе закрыты. Гэта значыць, рукапісы трэба прысылаць выключна пад дэвізамі (умоўнымі абазначэньнямі — словамі, сказамі) з адначасным дадаткам запячатаных канвэртаў пад тымі-ж самымі дэвізамі, у якіх хаваецца паведамленьне аб прозьвішчы, імені і адрас аўтара. Дэвізныя канвэрты прэміяваных твораў ускрываюцца пасьля канчатковай пастановы савету журы аб выніках конкурсу. Дэвізы тых твораў, якія прэміі не атрымалі, але якія прызнаны годнымі для друку, ускрываюцца па згодзе аўтара.
8. Рукапісы дасылаць на адрас: **Менск, Савецкая, 63, БДВ, Юнсэктару.** З паметкай «На конкурс дзіцячай кніжкі».

ПРЭМІІ: 1-ая прэмія . . . 1.000 руб. 2-ая—4 прэміі па . 500 » 3-яя—4 прэміі па 250 руб. 4-ая—6 прэмій па 100 »

Усе рукапісы прэміяваныя, а таксама і тыя, што прэміі не атрымалі, але прынятыя ў друкаваны аркуш (1 аркуш—40.000 літар).

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Народны Камісарыят Асьветы БССР.

Даводзім да ведама ўсіх грамадзян, ШТО ДАПЛАТНЫЯ ЛІСТЫ, якія пасылаюцца па адрасе—Менск, бюро падпіскі „Кніга поштай" БДВ, Ленінская, 19— **выкупляцца ня будуць.**
Бюро падпіскі „Кніга Поштай".

Да ведама дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый.
ЗАЯЎКІ на неабходную колькасьць СЕНА і САЛОМЫ на перыяд красавік-чэрвень будуць **ПРЫМАЦЦА „САЮЗХЛЕБАМ" ДА 15 САКАВІКА.**
Пасьля паказанага тэрміну заяўкі прымацца ня будуць.
Арганізацыі, якія не паддадуць заявак да зазначанага тэрміну, ня будуць уключаны ў плян забясьпечаньня на гэты перыяд. Заяўкі прымаюцца ва ўсіх акруговых аддзяленьнях «Саюзхлеба».
„САЮЗХЛЕБ".

ЭЛЬВОД паведамляе, што, з прычыны ачысткі каталёў, будзе СПЫНЕНА ПАДАЧА ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ
на працягу некалькіх дзён
з 6 да 10 гадз. увечары
ў раёнах: Першамайскай, Акольнай, Гарбарнай, Савецкай (у бок Камароўкі), Доўгабродзкай, Чырвонасьцяжнай, Гандлёвай, Кастрычніцкай, Садовай, Пралетарскай і Капярынінскай вуліц, а таксама Ніжняга рынку.

12-га сакавіка а 7 гадзіне ўвечары
ў памяшканьні праўленьня Белкахотсаюзу (Савецкая, 71, ва дварэ) адбудзецца
нарада ўсіх кролікаводаў,
якія пражываюць у г. Менску і ў гарадзкой чарце па пытаньнях разьвядзеньня кролікаў і арганізацыі сэкцыі кролікаводаў.
Асобы, якія зацікаўлены ў разьвядзеньні кролікаў, запрашаюцца на гэту нараду.
БЕЛКАХОТСАЮЗ.

Для здачы **АБВЕСТКІ** ў газэту **„ЗЬВЯЗДА"** звяраюцца па тэл. **7-81**

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Паступіла ў продаж
СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ БІБЛІЯТЭКА і Аўчыньнікаў
Галоўныя паразыты свойскае жывёлы
Стар. 67. Цана 15 кап.
Белдзяржвыдавецтва.

ЛІКВІДКОМ Аршанскага райкому саюзу мэталістых
просіць усіх осіб і арганізацыі, маючых якія-небудзь прэтэнзіі да Аршанскага райкому саюзу мэталістых, падаць гэткія не пазьней 12-га сакавіка г. году на імя ліквідкому райкому саюзу мэталістых па адрасе: г. Ворша, АПБ.

ШУКАЮ
ДРАЗДОВА Сьцяпана Лукашова, гр-на вёскі Гараватка, Шыляўскага с-с., Бялыніцкага раёну, Магілеўскай акругі. Асоб, што ведаюць яго месцазнаходжаньне, просьба паведаміць гр-ну Дразду Ягору на вышэйпаказаным адрасе.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.

Менск, Галоўпітэя № 337.